СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	IV квартал
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

22 ВЕРАСНЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 185
(26793)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

ЯК ЗМАГАЦЦА З «НЯПРАВІЛЬНЫМ» ЦІСКАМ?

На гэтае і іншыя пытанні адкажа падчас нашай чарговай «прамой лініі» **кандыдат медыцынскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» Марыя Міхайлаўна ЛІВЕНЦАВА**.

«Прамая лінія» з яе ўдзелам адбудзецца **24 верасня, у пятніцу, з 12.00 да 13.00** па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ У ТРОХГАДОВЫ ТЭРМІН ВЫВЕСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЛЬНЯНОЙ ГАЛІНЫ НА РЭНТАБЕЛЬНУЮ РАБОТУ

Фота БЕЛТА.

Адпаведнае даручэнне Прэзідэнт Беларусі даў учора ў ходзе рабочай паездкі ў Віцебскую вобласць, перадае БЕЛТА.

Прыехаўшы ў ААТ «Дубровенскі льнозавод», кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да прысутных чыноўнікаў, адразу абазначыў, што «засталося дзве тэмы, якія не паглядзелі па-буйному, — гэта льновытворчасць і цукровыя буракі».

Што датычыцца лёну, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што зыходзячы з той інфармацыі, якую ён атрымлівае, «працуем вельмі дрэнна».

Як далажылі Аляксандру Лукашэнку, ільняная сыравіна карыстаецца вялікім попытам на знешніх рынках, а да традыцыйна высокага попыту ў бягучым годзе дабавіўся яшчэ і фактар неўраджаю гэтай культуры ў іншых еўрапейскіх краінах. Аднак кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што нават калі будуць закрыты знешнія рынкі, то неабходна айчыннае льновалакно перапрацаваць у тканіны і забяспечыць пасцельнай бялізнай і іншымі вырабамі з лёну школы, дзіцячыя сады, ваенных, чыноўнікаў і інш. У якасці прыкладу ён заўважыў, што сам выкарыстоўвае пасцельную бялізну з лёну.

«Лёну ў Беларусі быць. Я не хачу, каб мы паўтарылі сітуацыю з бульбай», — падкрэсліў Прэзідэнт, маючы на ўвазе тое, што цяпер даводзіцца аднаўляць вытворчасць у Беларусі гэтай культуры з-за няправільных рашэнняў, прынятых некалькі дзесяцігоддзяў таму. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што лён у Беларусі мае своеасаблівае палітычнае значэнне, бо адлюстраваны на гербе рэспублікі. «За лён будзем патрабаваць не менш, чым за збожжа».

У прыватнасці, была абмеркавана перспектыва стварэння на Віцебшчыне холдынга па вырошчванні і перапрацоўцы лёну на базе Аршанскага льнокамбіната. Плануецца, што ў склад холдынга ўвойдуць ільнозаводы, а таксама ўласная тавараправодная сетка ў Беларусі і за мяжой. Акрамя таго, у рамках холдынга будзе наладжана ўзаемадзеянне з ільнонасенстанцыямі рэспублікі, Інстытутам лёну НАН Беларусі, швейнымі фабрыкамі, банкаўскім сектарам і інш. Аляксандр Лукашэнка даручыў зацікаўленым бакам дасканала прапрацаваць усе пытанні і з красавіка наступнага года пачаць стварэнне холдынга. Ён падкрэсліў, што неабходна як мага хутчэй рэалізоўваць усе намечаныя планы і праграмы па развіцці льнаводчай галіны ў Беларусі.

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧАЛАВЕК-КРЫНІЦА

Гледзячы на статнага, урачыста апранутага, я сказаў бы, стыльнага чалавека, хіба дасі веры, што менавіта ён, уласнаручна, стварыў на нашай зямлі самы прыгожы крынічны комплекс (гэта зусім не перабольшанне)? Нядаўна Алег Вайцяховіч быў тут у якасці звычайнага будаўніка, прараба і архітэктара адначасова. Насіў камяні і цяжкія бярвенні, мяшаў цэмент, капаў зямлю і гліну. Ён прымусіў ваду не проста збягаць у прыгожую студню, а ліцца ў яе і струменіць, гуляючыся пырскамі, песціць слых і цешыць вока гарманічным спалучэннем стыхій прыроды. Наогул, уявіць, што тут была сапраўдная ўдарная будаўнічая пляцоўка, сёння немагчыма. Ды і ці трэба ведаць, трапіўшы ў лясны каньён на памежжы Мёрскага і Глыбоцкага раёнаў, якімі высілкамі ствараюцца на зямлі гэткія вось цуды? Усё адно не спасцігнуць, як ні намагайся, не паставіўшы перад сабою мэту таксама пакінуць штосьці добрае для людзей.

Ахвяраваць сабой. Калі Алег Вайцяховіч браўся за буйную рэстаўрацыю крыніцы Яна, якую ён ведае ўжо болей за сорак гадоў (амаль ад нараджэння), дык ім рухаў покліч адданага сына сваёй зямлі, на якой жылі продкі і будуць жыць ягоныя землякі. Адным словам, месца гэтае для яго нібы святое. Як бы пафасна гэта ні гучала.

— Я рабіў для людзей, для Бога, для маіх веруючых бацькоў, якія вучылі ніколі не рабіць злога і дрэннага іншым, — кажа Вайцяховіч, прыехаўшы на ўрачыстае асвячэнне адноўленай ім крыніцы і купелі на Галавасека — у праваслаўнае свята Адсячэння галавы Іаана Прадцечы.

Я ж паспрабаваў высветліць, ці лёгка звычайнаму вясковаму жыхару здзяйсняць гэткія праекты, хто дапамагаў і падтрымліваў, ці не шкадуе пра час, за які мог зрабіць і здзейсніць шмат чаго іншага. Напэўна, гэтая праца шмат чаму яго навучыла.

СТАР. 6

«ЖЫЦЦЁ» РЭЦЭПТАЎ ДЛЯ ХРАНІЧНЫХ ХВОРЫХ ПАВЯЛІЧЫЦЦА ДА ПАЎГОДА

Каб зменшыць нагрузку на ўрачоў-тэрапеўтаў і «вузкіх» спецыялістаў амбулаторна-паліклінічных устаноў, а таксама палепшыць даступнасць і якасць аказання медыцынскай дапамогі пацыентам у амбулаторных умовах былі ўнесены важныя змяненні ў дзейны парадак выпіскі рэцэптаў пацыентам з хранічнымі захворваннямі.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, пастановай Савета Міністраў ад 15 верасня 2010 года № 1323 прадугледжваецца магчымасць выпісвання рэцэптаў пацыентам, якія маюць хранічныя захворванні, на атрыманне лекавых сродкаў бясплатна або на льготных умовах на тэрмін адразу да шасці месяцаў. Пасля таго, як пацыентам будуць выкарыстаныя ўсе выпісаныя лекавыя сродкі, яго ўрач мае права зноў выпісаць такому пацыенту лекавыя сродкі на льготных умовах ці бясплатна на тэрмін лячэння да паўгода.

«Наяўнасць заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай ці медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі датычыцца толькі выпісвання на льготных умовах неабходных сродкаў», — патлумачылі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Автомагистраль» (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания операторской АЗС** (инв. № 310/С-34021), об.пл. 15,8 кв.м., расположенного по адресу: Гомельская область, Гомельский район, Бобовичский с/с, вблизи д. Сосновка. **Начальная цена с НДС (снижена на 20%) – 7 295 182 бел. руб.** Площадь земельного участка **2,4318 га**. Задаток 900 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.07.2010. Аукцион состоится 01.10.2010 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.09.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 28 СЕНТЯБРЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 25 сентября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 28 сентября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 25 сентября 2010 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 65, 218 84 73.

УНП 100325912.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.09.2010 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША 3 030,00	1 чэшская крона 161,23	USD 31,0814	Агенцтва Уладзіміра Гаўрова
▼ 1 еўра 3 965,06	1 польскі злоты 1006,85	10 UAH 39,1700	
1 латвійскі лат 5 599,19	▼ 1 расійскі рубель 97,49	1000 BYR 10,2579	
1 літоўскі літ 1 150,34	1 украінская грыўня 381,73	EUR 40,6483	

Бізнэс-асяроддзе

Крэдытныя кааператывы: НЕАБХОДНЫЯ ГРОШЫ Ў ПАТРЭБНЫ ЧАС

Крэдытныя кааператывы — гэта не новы, а толькі крыху забыты ў нас, але вельмі папулярны ў свеце, у тым ліку ў краінах-суседзях, даволі стары ўжо спосаб «перахопу» грошай на невялікі тэрмін. Сутнасць спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі (так іх называюць згодна з заканадаўствам) зводзіцца да функцыі касы ўзаемадапамогі, якую складаюць са сваіх сродкаў і якой карыстаюцца толькі члены кааператыва.

Падобныя фінансавыя арганізацыі ў Еўропе ўтварыліся з прафесійных саюзаў. У Беларусь крэдытныя кааператывы прыйшлі асобна. Але сутнасць ад гэтага не змянілася — мэты першых і другіх супадаюць: дапамагчы членам свайго калектыву. Калектыў складаюць грамадзяне або арганізацыі, аб'яднаныя па нейкай прыкмеце: тэрытарыяльнай, прафесійнай, творчай альбо іншай. Сваю гісторыю крэдытныя кааператывы налічваюць з XIX стагоддзя.

Калектыў ПТ «Спектр» прадстаўляюць маладыя спецыялісты Юрый САЦУТА, Марына КАЛЕСНІК, Сяргей ЮРКЕВІЧ, Вераніка КАЛЕКА, Іван КМІТА. З верхняга паверха прыгожага будынка (там у некалькіх пакоях размясціўся ПТ «Спектр») выразна бачны далі новага Мінска.

ГІСТОРЫЯ

Сёння ва ўсім свеце ў кааператывах захоўваецца каля $1,1 трл. Гэта рэкорд за ўсю гісторыю, які тлумачыцца тым, што ў крызісныя часы патрэба ў інструментах мікрафінансавання ўзрастае. Зараз у Сусветны савет крэдытных кааператываў (WOCCU) уваходзіць амаль 50 тысяч саюзаў, якія існуюць у 98 краінах свету і абслугоўваюць каля 186 млн пайшчыкаў. На долю крэдытных саюзаў прыпадае каля 8 працэнтаў усяго сусветнага грашовага абарачэння. З пачатку 2010 года членам Сусветнага савета крэдытных кааператываў стала і Беларусь.

Першы фінансавы кааператыў у нашай краіне быў створаны ў 2002 годзе, ён аб'ядноўваў юрыдычных асобаў. Гэтая арганізацыя працавала на падставе пастановы Савета Міністраў аб таварыствах узаемнага крэдытавання. Праз два гады ўзнік і кааператыў, пайшчыкамі якога сталі грамадзяне. Цяпер такіх большасць. У 2008 годзе фінансавыя кааператывы Беларусі аб'ядналіся ў Рэспубліканскую асацыяцыю спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі. Сёння ў Асацыяцыю ўваходзіць 19 крэдытных саюзаў.

13 жніўня новым членам Асацыяцыі стал **СК «Спектр-Капітал»**, а 2 верасня — **СК «Таварыства ўзаемнага крэдытавання «Капітал-Інвест».**

Абодва гэтыя кааператывы аб'ядноўвае ў **Простае таварыства «Спектр»**, якое актыўна заявіла пра сябе на фінансавым рынку краіны.

ISSN 1990 - 763X

Старшыня ПТ «Спектр» Аляксандр Іванавіч ГАНЧАРОЎ.

МАГЧЫМАСЦІ

— Наш кааператыў аб'ядноўвае грамадзян па тэрытарыяльнай прыкмеце — жыхароў Беларусі, — патлумачыў «Звяздзе» **дырэктар Спажывецкага кааператыва «Спектр-Капітал» Іван КМІТА.** — Актыўную дзейнасць мы ажыццяўляем каля месяца. За гэты час удзельнікамі кааператыва стала больш за 10 чалавек. З іх два чалавекі размясцілі грошы ў кааператыве, а астатнія — узялі.

Мы выдаём мікрапазыкі пад 4 працэнты ў месяц. Пакуль максімальны памер пазыкі — 9 млн беларускіх рублёў. Тэрмін — да 3 месяцаў.

Мы таксама прымаем пазыкі на прыцягненне грошай да 30 млн беларускіх рублёў. Стаўка па прыцягнутых пазыках складае 27 працэнтаў у год, але, дзякуючы капіталізацыі, за 2 гады прыбытак можа дасягнуць 29 працэнтаў. Гэта значна больш, чым прапануюць банкі.

— Чым вы забяспечваеце такую высокую стаўку?

— Тым, што даём мікрапазыку членам кааператыва на карацейшы тэрмін, чым прыцягваем. Прыцягнутыя грошы дробяцца і выдаюцца членам кааператыва. Ва ўсім свеце шырока выкарыстоўваецца такая практыка, шмат дзе непасрэдна на вялікай вытворчасці існуюць крэдытныя саюзы, якія выдаюць пазыкі ўдзельнікам вытворчасці.

Наша стаўка па выдадзенай пазыцы — 4 працэнты ў месяц. Гэта 48 працэнтаў гадавых. Розніца паміж стаўкамі прыцягнутых пазык і выдадзеных і складае маржу.

— 48 працэнтаў гадавых — немаленькая стаўка.

— Так, немаленькая, але ў адрозненне ад банкаў, якія даюць спажывецкія крэдыты пад абвешчаныя 12-15 працэнтаў, мы не бяром камісій і іншых выплат, ***таму 4 працэнты ў месяц — гэта рэальныя чатыры працэнты ў месяц.*** Эфектыўная, або поўная, стаўка па спажывецкіх крэдытах у банках, разам з камісіяй, насамрэч складае да 60 працэнтаў гадавых і больш. Гэта не сакрэт. Проста ў камісіі банк звычайна піша маленькімі літарамі, а пра поўную стаўку крэдытаатрымальнік часта даведваецца толькі пры падпісанні дагавора.

Рэспубліканская асацыяцыя спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі, у якую мы ўваходзім, рэгулярна праводзіць маніторынг банкаўскіх спажывецкіх крэдытаў. Дык вось, мы тут складаем банкам добрую канкурэнцыю.

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

— Якія ўмовы патрэбныя для атрымання мікрапазыкі ў СК «Спектр-Капітал»?

— Пазыкі выдаюцца толькі пайшчыкам. Тое самае датычыцца і тых, хто жадае размясціць свае сродкі.

Кожны, каму тэрмінова патрэбны грошы, цяпер можа зрабіць выбар: узяць іх у банку або ў кааператыве. Каб узяць пазыку ў кааператыве, трэба стаць яго членам. Для гэтага трэба напісаць заяву, унесці 20 тысяч беларускіх рублёў уступнага ўнёску і 20 тысяч — паявога.

Другая ўмова — для тых членаў кааператыва, якія звяртаюцца да нас упершыню, — паручыцельства.

Наш прынцып работы — індывідуальны падыход да кожнага пайшчыка і ўніканне ў яго сітуацыю. А сітуацыі могуць быць самыя розныя. Таму мы заўсёды шукаем магчымасць дапамагчы. Умовы для актыўных членаў кааператыва яшчэ больш зручныя.

Днямі праўленне Спажывецкага кааператыва «Спектр-Капітал» прыняло рашэнне даваць невялікія грашовыя пазыкі ў суме да 1 200 тысяч беларускіх рублёў ***пад слова гонару.*** Для таго, каб атрымаць такія грошы, дастаткова прыйсці да нас з пашпартам і назваць пяць тэлефонных нумароў, па якіх абаненты пацвердзяць прыстойнасць патэнцыйнага пазычальніка.

УНІКАЛЬНЫЯ ПРАПАНОВЫ

— Наш кааператыў, у адрозненне ад «Спектр-Капітала», аб'ядноўвае юрыдычных асобаў, — расказвае **дырэктар спажывецкага кааператыва «Таварыства ўзаемнага крэдытавання «Капітал-Інвест» Юрый САЦУТА.** — Гэта — суб'екты малога і сярэдняга бізнэсу, якія размешчаны ў Беларусі. Звяртаюцца да нас і даволі буйныя кампаніі, напрыклад, будаўнічыя і нафтаперапрацоўчыя. Для іх вельмі зручна тое, што мы прымаем рашэнне хутка — на працягу сутак, ды і пералік неабходных дакументаў для атрымання пазыкі ў кааператыве значна меншы, чым у банку.

Згодна з заканадаўствам, юрыдычным асобам для таго, каб карыстацца агульнай касай узаемадапамогі, трэба ўнесці паявы ўнёсак у эквіваленце 300 еўра. На паявы ўнёсак працэнты не налічваюцца: калі пайшчык пажадае выйсці з кааператыва, гэтая сума яму вяртаецца ў тым жа памеры.

А вось на прыцягнутыя грашовыя сродкі ад юрыдычных асобаў «Капітал-Інвест» прапануе стаўку да 30 працэнтаў гадавых.

Членства ў кааператыве дае магчымасць узяць мікрапазыку **для адкрыцця або развіцця бізнэсу** ў памеры да 30 млн беларускіх рублёў пад 4 працэнты ў месяц тэрмінам да 4 месяцаў. Часта гэта можа быць адзінай магчымасцю атрымаць неабходныя сродкі, бо банкі, пры адсутнасці матэрыяльных актываў і вартага закладу, адмаўляюць у крэдыце.

Сёння ў Беларусі з юрыдычнымі асобамі працуюць тры крэдытныя кааператывы, з іх актыўна, бадай што, толькі «Капітал-Інвест». Таму накоплены вопыт пакуль невялікі, і сітуацыі сустракаюцца даволі ўнікальныя. Асаблівасць работы ПТ «Спектр» — смеласць у прыняцці новых рашэнняў.

АБ'ЯДНАНАЯ ДАПАМОГА

Праца ў тандэме двух кааператываў — невыпадковая з'ява, а асэнсаванае рашэнне, якое дазваляе знайсці прымальны фінансавы варыянт для любых сітуацый, звязаных з прыватным жыццём або бізнэсам.

Вельмі важна, што абодва кааператывы — «Спектр-Капітал», які аб'ядноўвае фізічных асобаў, і «Капітал-Інвест», у які ўваходзяць юрыдычныя асобы, — працуюць у адным памяшканні.

— Бываюць выпадкі, — кажа Юрый Сацута, — калі па пазыку прыходзіць індывідуальны прадпрымальнік, які працуе без стварэння юрыдычнай асобы і адкрыцця разліковага рахунку. Акрамя таго, калі ён жадае пазычыць невялікую суму для развіцця свайго бізнэсу, яму вылучыць са сваіх абаротных сродкаў 300 еўра на паявы ўнёсак таксама бывае праблематычна. І тады мы садзімся разам — дырэктары абодвух кааператываў і патэнцыйны пазычальнік, усё пралічваем і бачым, што ў гэтым выпадку больш выгадна ўзяць пазыку як фізічнай асобе.

У падобных выпадках становіцца відавочнай перавага нашай сумеснай працы.

НАДЗЕЙНАСЦЬ

— Наколькі надзейна даверяць спажывецкаму кааператыву свае грошы?

— Гарантам захаванасці сродкаў з'яўляецца ўжо тое, што грошы, якія нам прыносяць нашы члены кааператыва, не ідуць ні на якія іншыя мэты, як толькі на пазыку нашым жа членам кааператыва, — адказвае Іван Кміта. — Сродкі круцяцца ўнутры калектыву, які ўтвараюць пайшчыкі.

Да таго ж, дзейнасць кааператыва цалкам празрыстая і падкантрольная для ўсіх яго членаў. Кожны з іх можа ў любы момант запатрабаваць справаздачу пра тое, каму і пад што вылучаныя грашовыя сродкі. Пайшчык таксама можа выбіраць — каму пазычаць грошы, пад які бізнэс або паслугу.

— А калі здарыцца так, што ўсе пазычальнікі грошы не вернуць?

— Забеспячэннем пазыкі для новага члена кааператыва з'яўляецца паручыцельства, заклад аўтамабіля або іншых матэрыяльных каштоўнасцяў. Да таго ж мы абавязкова вывучаем плацежаздольнасць і крэдытную рэпутацыю патэнцыйнага пазычальніка. Уважліва гутарым з кожным.

Нават калі даём пазыку ў суме да 1 200 тысяч беларускіх рублёў, пры якой не патрабуюцца паручыцельства і даведкі, астатнія члены кааператыва абароненыя дагаворам. У выпадку невяртання пазыкі справа перадаецца ў суд, і тады нядобрасумленны пазычальнік акрамя вяртання асноўнага доўгу і працэнтаў павінен будзе заплаціць штраф у памеры 100 працэнтаў ад пазычанай сумы. Не вяртаць грошы вельмі нявыгадна.

Але мы не зацікаўленыя ў тым, каб браць больш грошай, чым напісана ў дагаворы. Таму мы падрабязна агаворваем з нашымі пайшчыкамі ўсе моманты, пралічваем усе варыянты, і гатовыя ісці насустрач, калі абставіны складаюцца так, што вяртанне пазыкі трохі разыходзіцца са складзеным графікам.

Акрамя таго, мы маем знешнюю крыніцу фінансавання, якую можам выкарыстоўваць пры кароткатэрміновых выдатках. Напрыклад, у выпадку, калі ўсе пазыкадавальнікі раптам вырашаць датэрмінова забраць свае грошы (а такое прадугледжана дагаворам) мы падстрахаваныя: сярод нашых членаў кааператыва ёсць надзейны партнёр, які гатовы падтрымаць нас у такой сітуацыі.

(Працяг на 3 стар.).

...ВЫВЕСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЛЬНЯНОЙ ГАЛІНЫ НА РЭНТАБЕЛЬНУЮ РАБОТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У ходзе абмеркавання планаў па тэхнераазнашчэнні льнаперапрацоўчых прадпрыемстваў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што да існуючых аб'ектаў інфраструктуры, капітальных пабудоў неабходна падыходзіць па-гаспадарску. Там, дзе магчыма, пры мадэрнізацыі іх неабходна дабудаваць, прывесці ў належны стан, але ні ў якім выпадку бяздумна не зносіць. Там жа, дзе гэта ўсё-такі неабходна, трэба таксама правільна з фінансавага пункту гледжання падыходзіць да ўзвядзення новых будынкаў, каб яны былі адначасова і танныя, і функцыянальныя. «Нам не патрэбны жалезабетон, як у савецкія часы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што такія аб'екты трэба будаваць з сучасных лёгкіх металічных канструкцый.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з экспазіцыяй разнастайнай прадукцыі з лёну, сучасным машынным комплексам для вырошчвання і перапрацоўкі гэтай культуры, тэхналагічнымі працэсамі перапрацоўкі льнотрасты. Увазе кіраўніка дзяржавы таксама была прадстаўлена выстаўка сельскагаспадарчай тэхнікі, што вырабляецца на прадпрыемствах Віцебскай вобласці.

У сакавіку бягучага года Аляксандр Лукашэнка таксама з мэтай азнаямлення са станам спраў у льнаводчай галіне краіны і выкананнем яго даручэнняў наведаў Аршанскі льнокамбінат. Тады Прэзідэнт выказаў цвёрдую ўпэўненасць, што льнаводчая галіна і вытворчасць прадукцыі з лёну ў Беларусі могуць і павінны быць канкурэнтаздольнымі, і падкрэсліў недапушчальнасць згортвання льняной галіны ў краіне. За апошнія пяць гадоў кіраўніком дзяржавы было дадзена каля 70 даручэнняў ураду па развіцці льнаводчай галіны.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МІХАЛКОЎ ЗАРОБІЦЬ НА ФЛЭШ-КАРТАХ І ДЫСКАХ

Акрэдытацыйная камісія пры Росаховакультуры выбрала Расійскі саюз праваўладальнікаў, заснаваны рэжысёрам Мікітам Міхалковым, у якасці арганізацыі, якая атрымае права спаганяць і размяркоўваць паміж аўтарамі грошы, атрыманыя ад імпарцёраў носьбітаў інфармацыі і электроннай тэхнікі.

Аўтары, выканаўцы і вытворцы музыкі або фільмаў маюць права атрымліваць збор за прайгравanne іх твораў у асабістых мэтах. Для гэтага і былі прыдуманыя зборы з імпарцёраў — як мабільных тэлефонаў, камп'ютараў і лічбавых камер, так і з дыскаў, флэш-карт і іншых носьбітаў інфармацыі. Колькі менавіта павінны будуць плаціць імпарцёры, пакуль невядома. Абмяркоўвалася стаўка ў адзін працэнт з абсталявання і тры працэнты — з носьбітаў. Пры такіх стаўках узровень збораў можа дасягнуць ста мільёнаў долараў у год.

БІЛ ГЕЙТС ПАЗБАВІЎ ДЗЯЦЕЙ СПАДЧЫНЫ

Адзін з найбагацейшых людзей планеты, заснавальнік кампаніі Microsoft Біл Гейтс адмаўляецца пакінуць свае грошы сваім дзецям. Як вядома, ён ужо перадаў 10 мільярдаў долараў на дабрачынныя мэты. Цяпер ён вырашыў перадаць яшчэ 30 мільярдаў. Гэтыя грошы будуць выкарыстаны на барацьбу з малярыяй і іншымі хваробамі.

Біл Гейтс трое дзяцей: 14-гадовая Джэніфер, 11-гадовы Рорі і васьмігадовая Фібі. Паводле слоў бізнэсмена, ён аддасць сваім дзецям частку грошай, але гэтая сума не будзе значнай доляй яго багацця. Як лічыць Гейтс, яго дзеці павінны працаваць і самі дабівацца поспеху, але пры гэтым адчуваць бацькоўскі клопат. Сам мільярдэр вось ужо два гады як пакінуў штодзённую працу ў Microsoft для таго, каб заняцца дабрачыннай дзейнасцю. Разам са сваёй жонкай ён арганізаваў фонд па барацьбе з хваробамі і голадам у краінах трэцяга свету.

ШКОЛЬНІКАЎ АБАВЯЗАЛІ ПЛАЦІЦЬ ЗА СПАЗНЕННІ

Школа ў Солт-Лейк-Сіці, штат Юта, увяла грашовыя штрафы для вучняў, якія спазняюцца.

Спазненне на ўрок абыдзецца школьніку ў пяць долараў. У выпадку, калі навучэнец не можа або не хоча плаціць штраф, яму прыйдзецца адседзець прымусовую паўгадзінную «прадоўжанку» па заканчэнні вучэбнага дня. Калі педагог палічыць прычыну спазнення вучня досыць уважлівай, ён мае права не караць дзіця, якое правінілася. Адзначаецца, што грошы, якія спаганяюць з прагульшчыкаў, будуць размяркоўвацца паміж настаўнікамі, вымушанымі заставацца пасля ўрокаў з пакаранымі вучнямі.

У БЛІЖЭЙШУЮ ПЯЦІГОДКУ СТАЛІЦУ ЧАКАЕ ПЕРАХОД НА АРТЭЗІЯНСКУЮ ВАДУ, А Ў АГРАГАРАДКАХ З'ЯВІЦЦА ВОДАПРАВОД

Ва ўрадзе

На разгляд прэзідыума Савета міністраў, пасяджэнне якога праходзіла ўчора пад старшынствам прэм'ер-міністра краіны Сяргея Сідорскага, унесена праграма па водазабеспячэнні і водаадводу «Чыстая вада» на 2011-2015 гг. Яе прадставіў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір БЕЛАХВОСТАЎ.

Забяспечанасць насельніцтва цэнтралізаваным водазабеспячэннем складае 86%, яго маюць 8,3 мільёна чалавек з 9,7 мільёна, якія пражываюць у краіне. З 2006 года ў эксплуатацыю ўведзены 262 аб'екты водазабеспячэння і водаадводу, у тым ліку 82 станцыі абезжалезвання, 19 водазабораў, 49 ачышчальных збудаванняў. На рэалізацыю папярэдняй аналагічнай праграмы, якая дзейнічала з 2005 па 2010 год, затрачана 730 мільярдаў рублёў, паведаміў Уладзімір Белахвостаў. У прыватнасці, станцыі абезжалезвання з'явіліся ў Шчучыне, Клічаве, Дзяржынску, Лідзе, Ашмянах, Высокім, Жабінцы. Пабудаванае другое адгалінаванне вадавода Брылевічы—Салігорск. Сучасная станцыя абезжалезвання з'явілася і ў Маладзечне: на водазаборы Галенава з пачатковым утрыманнем жалеза 1 мг/л насельніцтву падаецца вада з рэшткавым утрыманнем жалеза 0,05 мг/л пры нарматыве 0,3 мг/л.

Будаўніцтва новых ачышчальных збудаванняў у Высокім і Мядзеле спыніла забруджванне стокавымі водамі вадаёмаў, у тым ліку возера Нарач. За гэты час былі рэканструяваны ачышчальныя збудаванні ў Віцебску, Лёзне, Шчучыне, Глуску, Дзяржынску, Жыткавічах. Цяпер, згодна з дакладам ПРААН «Паказчыкі развіцця чалавека», наша краіна ўваходзіць у групу з 34 краін, насельніцтва якой мае 100-працэнтны доступ да палепшаных крыніц вады, паведаміў Уладзімір Белахвостаў.

Тым не менш, як падкрэсліў міністр, маецца яшчэ шэраг праблем у галінах водазабеспячэння і водаадводу. Цэнтралізаванага водазабеспячэння не мае каля 1,4 мільёна чалавек, у тым ліку 1,1 мільёна ў сельскай мясцовасці. Каля двух мільёнаў жыхароў нашай краіны выкарыстоўваюць ваду з цэнтралізаваных крыніц з утрыманнем жалеза вышэй за санітарныя нормы ў 0,3 мг/л, 8% водаправодных і 5% каналізацыйных сетак патрабуюць замены. Неабходна рэканструяваць і мадэрнізаваць 227 ачышчальных збудаванняў і каналізацый з прымяненнем сучасных тэхналогій і абсталявання.

Гэтыя праблемы мяркуецца вырашыць у бліжэйшую пяцігодку. Праграма «Чыстая вада» прадугледжвае рэалізацыю 1946 мерапрыемстваў, на фінансаванне якіх плануецца накіраваць 3,5 трыльёна рублёў. Мерапрыемствы па цэнтральным водазабеспячэнні, а таксама па паляпшэнні якасці вады закрануць населеныя пункты, дзе пражывае 950 тысяч насельніцтва. Будзе рэканструявана 84 станцыі абезжалезвання, пракладзена 360 км водаправодаў, на што будзе выдаткавана 365 мільярдаў рублёў.

Што датычыць сталіцы, то на бліжэйшую пяцігодку мяркуецца ажыццявіць паэтапны пераход на водазабеспячэнне з падземных крыніц. Да 2016 года на гэтыя мэты пойдзе 312 мільярдаў рублёў, паведаміў міністр.

Але праграма, улічваючы аб'ёмы фінансавых укладанняў, носіць сельскую накіраванасць, падкрэсліў Уладзімір Белахвостаў. Да 2016 года больш за 1 мільён чалавек, якія пражываюць ў аграгарадках, будуць мець цэнтральнае водазабеспячэнне. Для гэтага будзе пабудавана 768 станцый абезжалезвання, 2 тысячы водаправодных сетак і 476 артэзіянскіх свідравін. Для гэтага неабходна 729 мільярдаў рублёў.

Будзе працягнутая праца па рэканструкцыі і мадэрнізацыі ачышчальных збудаванняў не толькі ў гарадскіх і сельскіх населеных пунктах, але і на прамысловых прадпрыемствах. Плануецца пабудаваць і рэканструяваць 227 ачышчальных збудаванняў. Усяго на развіццё сістэм водаадводу будзе выдаткавана каля трэці сродкаў, закладзеных у праграму, паведаміў міністр.

Уладзімір Белахвостаў звярнуў увагу, што ўпершыню адной з фінансавых крыніц стануць інавацыйныя фонды аблвыканкамаў. Прапанавана павялічыць адлічэнні, якія робяць арганізацыі сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў інавацыйныя фонды, да 25% ад сабекошту паслуг водазабеспячэння і водаадводу. Гэта дазволіць накіраваць на фінансаванне праграмы каля трыльёна рублёў. У мэтах недапушчэння росту бюджэтных субсідый на аказанне паслуг будзе ўведзена інвестыцыйная складовая ў тарыфы на паслугі водазабеспячэння і водаадводу. Пры гэтым плацяжы за стандартную трохпакаёвую кватэру, дзе пражывае 3 чалавекі, не перавысяць тых межаў, якія ўжо запланаваныя бюджэтам.

У выніку рэалізацыі праграмы якаснай пітной вадой будзе забяспечана не толькі насельніцтва гарадоў і райцэнтраў, пасёлкаў гарадскога тыпу, але і ўсе жыхары аграгарадкоў, дзе з'явіцца цэнтралізаванае водазабеспячэнне, рэзюмаваў міністр. **Павелічэнне надзейнасці работы сістэм водазабеспячэння і водаадводу шляхам перакладкі сетак дазволіць знізіць страты на 3-4%,** што складзе 25 мільёнаў кубаметраў у год. Гэты накірунак праграмы прадыктаваны патрабаваннем Дырэктывы № 3, паколькі да 40 % сабекошту падрыхтоўкі вады і водаадводу складае кошт электраэнергіі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Абзац

◢ Астранамічная восень уступіць у свае законныя правы 23 верасня. Па сведчанні спецыялістаў, у 6 гадзін 9 хвілін паводле беларускага часу сонца перасячэ нябесны экватар і пяройдзе з паўночнага паўшар'я нябеснай сферы ў паўднёвае. Такое здараецца толькі два разы ў год — у дні вясновага і восеньскага раўнадзенства. Дзённае святло раніцай будзе ўзыходзіць сапраўды на ўсходзе і ўвечары заходзіць сапраўды на захадзе, а дзень зраўняецца з ноччу. Па народным календары, у гэты дзень пачынаецца залатая восень, якая працягнецца да 14 кастрычніка. Лічыцца, якое надвор'е будзе ў дзень раўнадзенства, такая будзе і восень. Таксама народныя прыкметы кажуць: чым верасень сушэйшы і цяплейшы, тым пазней наступіць сапраўдная зіма.

◢ **Вечарам 21 верасня ў Калінкавічах 25-гадовая жанчына-кіроўца ўчыніла наезд на дзвюх дзяўчын. Жанчына рухалася на аўтамабілі «Форд Мандэа» і збіла дзяўчат 19 і 20 гадоў, якія пераходзілі дарогу паблізу пешаходнага пераходу. Пацярпелыя шпіталізаваныя са страсеннем мазгоў і іншымі траўмамі.**

◢ Лік людзей, якія пакутуюць на хваробу Альцгеймера, імкліва расце. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што лік хворых павялічыцца ўдвая на працягу бліжэйшых 20 гадоў. Зараз на гэтае захворванне пакутуе каля 35 млн чалавек. Па прагнозах спецыялістаў, да 2030 года гэтая хвароба будзе выяўлена ў 66 млн чалавек, а да 2060 года — у 115 млн.

Поўны абзац

◢ У Нямеччыне прайшла рэгата на гарбузах. У нямецкім горадзе Людзігсбурзе прайшоў заплыў на лодках, выкарыстаных з буйных пладоў гарбуза. Рэгата прайшла ў гонар восеньскага фестывалю ўраджаю. Фестываль ураджаю гарбузоў праходзіць у Германіі да ліставпада. Кожны год ён мае сваю тэму. Некалькі гадоў таму ён быў прысвечаны астраноміі (з гарбузоў выраблялі планеты і іншыя нябесныя аб'екты), а сёлета ў цэнтры свята апынулася марская тэма. У рамках фестывалю праходзіць і кулінарны конкурс, падчас якога ўдзельнікі гатуюць з гарбуза разнастайныя стравы — супы, пялымені, штрудзелі і нават шампанскае.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ГРЫБОЎ ШМАТ, АТРУЧЭННЯЎ ТАКСАМА

19 чалавек з пачатку гэтага года атруціліся грыбамі ў Брэсцкай вобласці. Як паведаміла **намеснік галоўнага ўрача абласнога Цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Таццяна КОРЧЫК**, найбольш выпадкаў атручэнняў прыпадае на ўжыванне так званых умоўна-ядомых грыбоў. Так, у канцы кнівіня сапраўдная гора прыйшло ў сям'ю жыхароў адной з вёсак Баранавіцкага раёна. Вяскоўцы назбіралі грыбоў парасонікаў, гаспадыня абдала іх варам і падсмажыла. Праз дзень тры чалавекі трапілі ў бальніцу. Дваіх удалося выратаваць, а 84-гадовая бабуля памерла. Таццяна Корчык яшчэ раз напомніла ўсім чытачам, што нельга браць невядомыя грыбы, нельга іх купляць у выпадковых людзей, бо невядома, дзе яны былі сабраныя. Атручэнне можа наступіць нават ад баравікоў, калі яны выраслі ў двух кроках ад буйной прамысловай зоны. Каб пазбегнуць атручэння, трэба адварваць грыбы двойчы, а ваду зліваць.

Яна СВЕТАВА.

Мова і Вера

Учора споўнілася 92 гады з дня нараджэння заснавальніка беларускай фразеалогіі Фёдара ЯНКОЎСКАГА. Пра гэта ўзгадалі не толькі беларускія мовазнаўцы, пісьменнікі і паэты, якія ў сваёй справе і жыцці не абыходзяцца без ягоных кніг і падручнікаў. Усласці кветкі да прысвечанай прафесару мемарыяльнай дошкі, якая размешчана на аднайменнай вуліцы ў мікрараёне Сухарава ў Мінску, прыйшлі вучні бліжэйшых гімназій і школы і прыхаджане праваслаўнага храма ў гонар Архістратыга Міхаіла.

— Ёсць пэўны сэнс у тым, што храм будуецца на вуліцы імя Фёдара Янкоўскага, — сказаў перад памінальным набажэнствам каля мемарыяльнай дошкі клірык Свята-Міхайлаўскага прыхода іерэй Аляксандр ШРАМКО. — Бо і мова, вывучэнню якой прысвяціў сваё жыццё Фёдар Янкоўскі, і вера — гэта рэчы духоўнага парадку, якіх мы павінны трымацца. Калі мы забываем пра гэта, мы страчваем сваю асабістую сутнасць, мы тады і сапраўды ператвараемся ў «чалавекаў», якія ёсць тое, што яны ядуць.

Менавіта прыходская абшчына стала ініцыятарам адкрыцця мемарыяльнай дошкі Фёдару Янкоўскаму год таму. Дарэчы, царкоўны староста Аляксандр НЕСЦЯРЧУК праз знаёмства з жыццём і дзейнасцю Фёдара Янкоўскага вырашыў выпісаць газету «Звязда».

— Да таго ж, менавіта ў «Звяздзе» некалькі гадоў таму з'явілася першая інфармацыя пра наш прыход, — расказвае Аляксандр Аляксандравіч. — Сёння мы ўжо распісваем сцены хрысцільнага храма і распачынаем будаўніцтва асноўнага. На жаль, два гады мы не маглі звярхнуцца з этапу катлавана. Цяпер знойдзены буйны спонсар і храм пачынае расці ўгару.

А беларускую мову можна пачуць і ў сухараўскім храме, і ў нядзельнай школе, дзе збіраюцца біблейскія вечарыны. Вось і цяпер прыход сабраў ля мемарыяльнай дошкі Фёдара Янкоўскага шмат дзяцей і прыхаджан, каб зноў нагадаць пра гэтага чалавека і пра значнасць ягонай справы для ўсіх нас.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НА «БЕЛАЗЕ» — ДЗЕНЬ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

25 верасня на Беларускім аўтамабільным заводзе пройдзе Дзень адчыненых дзвярэй. З 11:00 да 14:00 тут чакаюць усіх, хто цікавіцца дзейнасцю завода. Як абяцаюць арганізатары, гасцям у гэты дзень будзе прапанавана азнаёміцца з узорамі тэхнікі, якую выпускаюць на прадпрыемстве, і пры жаданні набыць сувеніры.

Ул. кар.

ЛОСЬ ПАГУЛЯЎ ПА МІНСКУ!

У Мінску, у мікрараёне Сухарава, днямі бачылі лася. Адпаведнае відэа з'явілася ў інтэрнэце. Аматарскія здымкі захавалі кадры таго, як лось блукае побач з аўтадарогай.

Адкуль у Мінску з'явілася гэтая жывёла, «Звязда» паспрабавала высветліць у Мінаблінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Дзяржінспектар Дзмітрый Тарайкоўскі растлумачыў: «Прыблізна з 20 жніўня па 20 лістапада ў ласёў — перыяд спарвання, ці гону. У гэты час жывёлы вельмі ўзбуджаныя, схільныя да міграцыі. Яны шукаюць новыя месцы для харчавання. А шлях гэтай міграцыі ляжыць якраз праз тэрыторыю Мінска і Мінскай вобласці». Дарэчы, гэта далёка не першы выпадак, калі такая жывёліна прыблукала на сталічныя вуліцы. Летась адно такое наведванне скончылася для лася трагічна: рагатага падарожніка проста ў цэнтры горада збіў аўтамабіль; яшчэ адзін лось прабіў вітрыну магазіна і добра-такі напракудзіў у салоне.

Яшчэ адна цікавая навіна прыйшла ў гэтай сувязі з Віцебшчыны: там каза, нейкім чынам сарваўшыся з прывязі, забралася ў тамбур дызель-цягніка Орша—Віцебск і некалькі дзясяткаў кіламетраў падарожнічала «зайцам», ажно да самой культурнай сталіцы Беларусі. Там гэтай «асобай» заняліся міліцыянеры. Было высветлена, што жывёліна належыць пенсіянеру, які не змог усачыць за ёю. Казу, якая, дарэчы, паводзіла сябе вельмі ціха, вярнулі гаспадару.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

РАЗБОЙНІКІ НА ВЯЛІКАЙ ДАРОЗЕ

Магілёўскі абласны суд вынес прысуд бандзе, якая летась рабавала і забівала людзей на аўтатрасе «Санкт-Пецярбург — Адэса».

Тры ўдзельнікі банды — жыхары Гомеля. Мужчыны ўзростам каля 40 гадоў працавалі ў Беларускім аб'яднанні джыу-джытсу і самаабароны. Кіраўнік банды да суда не дажыў: ён скончыў жыццё самагубствам за кратамі. Адзін з яго былых таварышаў прызнаны вінаватым у некалькіх забойствах і асуджаны на выключную меру пакарання, другі — на пажыццёвае зняволенне.

Летась узброеныя бандыты нападалі на людзей, якія спыняліся адпачыць на аўтатрасе ў Быхаўскім і Магілёўскім раёнах. Яны палявалі на транзітныя аўтамабілі. Іх ахвярамі сталі жыхары Расіі і Малдовы: 4 чалавекі загінулі, 2 параненыя. Муж з жонкай, якія вярталіся з адпачынку ва Украіне ў Санкт-Пецярбург і спыніліся адпачыць каля вёскі Абідавічы ў Быхаўскім раёне, здолелі ўцячы параненымі. Праўда, на суд яны не прыехалі — не хочуць узгадваць перажыты жах. Бандыты забілі двух расіян, адзін з якіх ехаў дадому з Украіны, а другі накіроўваўся на адпачынак у беларускі санаторый. Ад іх рук загінулі бацька і сын з Малдовы, якія ехалі ў Маскву на працу... Міліцыя адшукала злачынцаў. Падсудныя прызналі сваю віну. Аднак цяжар злачынстваў абумовіла суровы прысуд, які, паводле закону, можа быць абскарджаны ва ўстаноўленым парадку.

Алена КАЗЛОВА.

Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ: «ДА НОВАГА ГОДА КВАТЭРЫ Ў МІНСКУ ДАРАЖЭЦЬ НЕ БУДУЦЬ»

ІСНУЕ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ, А НЕ ПОПЫТ

Старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», кіраўнік сталічнага агенцтва нерухомасці «БелЦТН» Мікалай Прасталупаў адзначыў нашай газеце, што патэнцыйныя пакупнікі актыўнічалі на другасным рынку жылля толькі першыя два тыдні верасня.

Ён лічыць, што вялікія доўгатэрміновыя крэдыты коштам каля 15—17 працэнтаў гадавых пацягне далёка не кожная мінская сям'я. Рэч у тым, што, згодна з гарадской статыстыкай, сярэдняя сталічная сям'я каля 80 працэнтаў сваіх даходаў траціць выключна на штодзённае жыццё. Другім фактарам, які абмяжоўвае жыллёвае крэдытаванне, з'яўляецца жорсткі механізм паручыцельства банкаў. Банкі патрабуюць паручыцеляў з сур'ёзнымі даходамі, а апошнія на паручыцельства згаджаюцца ўжо неахвотна.

ДАРАГОЕ ЖЫЛЛЁ АМАЛЬ НЕ ПРАДАЕЦЦА

Згодна са статыстыкай інфармацыйнага каталога сталічнага партала жыллёвай нерухомасці, сярэдні кошт прапановы квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр складае сёння 1389 долараў. Спецыялісты партала падлічылі, што нават па аднапакаёвых кватэрах попыт крыху большы за прапанову толькі ў Цэнтральным і Савецкім раёнах. У астатніх раёнах Мінска прапанова па аднапакаёўках вялікая, а рэальных пакупнікоў амаль няма.

Самыя танныя аднапакаёвыя кватэры па кошце ад 35 да 37 тысяч долараў сёння прапануюцца ў сталіцы па вуліцах Чыгладзэ, Красіна, Казінца, Уральскай, Брэсцкай, у Заводскім раёне і Шабанах. Галоўным чынам гэта «хрушчоўкі» ў старых пяціпавярховых дамах з агульнай плошчай ад 29 да 33 квадратных метраў. Максімальная колькасць прапаноў аднапакаёвых кватэр прыпадае на стандартнае жыллё з цэнтнікам ад 40 да 50 тысяч долараў. Аднапакаёвыя кватэры коштам звыш 52—55 тысяч долараў цяпер увогуле лічацца «вісякамі», бо імі сёння ніхто амаль не цікавіцца. Выключэнне складаюць толькі вялікія па плошчы аднапакаёўкі, у якіх зроблены якасны еўрарамонт, дом знаходзіцца ў прэстыжным месцы і г.д.

Сярэдні кошт квадратнага метра двухпакаёвых кватэр згодна з каталогам прапановы складае 1376 долараў. Зусім слабенькія па якасці двухпакаёвыя «хрушчоўкі» патаннелі сёння нават у параўнанні са жніўнем. Цяпер такія «двушкі» агульнай плошчай ад 36 да 43 квадратных метраў магчыма набыць за 42—45 тысяч долараў. Па кошце да 52—55 тысяч долараў магчыма адшукаць стандартную двухпакаёвую кватэру нават у дзевяціпавярховых не вельмі старых дамах бадай у любым спальным раёне Мінска.

Вышэй мы агучылі сярэдні кошт прапановы. Мікалай Прасталупаў адзначае, што цяпер двух- і трохпакаёвыя кватэры рэальна прадаюцца толькі ў тых выпадках, калі кошт квадратнага метра ў іх складае 1230—1250 долараў.

ПРАПАНОВА НОВЫХ КВАТЭР — МІНІМАЛЬНАЯ

Паводле інфармацыі Мікалая Прасталупава, у апошнія некалькі месяцаў на жыллёвым рынку сталіцы істотна паменьшылася прапанова кватэр у новабудоўлях тых дамоў, якія ўжо здадзены ў эксплуатацыю ці будуць пабудаваныя ў бліжэйшыя 2—3 месяцы. У асобных новабудоўлях кватэры на продаж існуюць, аднак цэннік там пачынаецца з 1500 долараў за квадратны метр. Ёсць на рынку і новыя дамы з таннейшым цэннікам за жыллёвы квадрат, але там кліентам прапануюцца кватэры сапраўды вялікіх плошчаў. Так, у мікрараёне Уручча-6 у пабудаваным доме прапануюцца шматпакаёвыя кватэры па фіксаваным кошце квадратнага метра — каля 4,1 млн рублёў. Цэннік жыллёвага квадрата невялікі, аднак па такім кошце прадаюцца толькі трох- і чатырохпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай ад 101 да 126 квадратных метраў. Атрымліваецца, што мінімальны кошт такіх кватэр складае ад 130 тысяч долараў і вышэй.

У гэтымі мікрараёне кліентам прапануюцца і меншыя па плошчы кватэры, напрыклад, двухпакаёвыя (67—72 кв. м), ці трохпакаёвыя (85—103 кв. м). Будаўніцтва квадратнага метра ў такім доме для чаргавікоў будзе каштаваць ад 3,4 млн рублёў, а для нечаргавікоў — ад 3,6 млн рублёў. Прапанова сапраўды прывабная, аднак трэба ўлічваць, што грошы на жыллё трэба плаціць сёння, а жылы дом будзе здадзены ў эксплуатацыю толькі ў трэцім квартале 2012 года.

У СТУДЗЕНІ м² — 1200 USD?

Сёння на другасным рынку сталіцы назіраецца плаўнае і амаль непрыкметнае патанненне квадратнага метра жылля. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што ў бліжэйшыя тры месяцы цэннік на другаснае жыллё ў Мінску застанецца нязменным ці будзе вагацца ў розныя бакі ў межах 3—5 працэнтаў. Апошнія падзеі ў банкаўскай сферы сведчаць пра тое, што камерцыйныя крэдыты на агульных падставах пад жыллёвую нерухомасць істотна не паменшацца. А гэта значыць, што рэальны попыт на старыя кватэры павялічвацца не будзе. Істотна патаннець кватэры на другасным рынку таксама не змогуць, бо прадаўцы ніколі не прадавалі сваю нерухомасць танней, чым яна прапануецца па лініі долевага будаўніцтва. Мікалай Прасталупаў прагназуе, што ў першы месяц наступнага года кошт квадратнага метра сталічных кватэр будзе вагацца ў межах 1200—1250 долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

СПАЧАТКУ ДАЖДЖЫ, А Ў ПЯТНІЦУ ЗНОЎ СОНЦА І ЦЯПЛО

Сёння праз тэрыторыю Беларусі на ўсход будзе рухацца атмасферны фронт. Таму павялічыцца воблачнасць, а ўначы месцамі, удзень у паўночна-усходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра 11—18 градусаў, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Міністэрства прыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Ужо ў чацвер да нас завітае скандынаўскі антыцыклон. Павялічыцца атмасферны ціск, і ападкаў ужо не будзе. Вецер паўночна-заходні ўмераны. Уначы пахаладае да плюс 3—8 градусаў, на тарфяніках Палесся чакаюцца замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў, удзень — 12—21 цяпла.

У пятніцу на тэрыторыі краіны будзе гаспадарыць антыцыклон. У Беларусі ўсталюецца сухое цёплае надвор'е. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература ўначы — 4—9, удзень — 16—22 градусы. Такі тэмпературны фон на 3—5 градусаў вышэй кліматычнай нормы трэцяй дэкады верасня.

Аднак ужо 25 верасня ў заходнія раёны краіны падыдзе атлантычны цыклон. У суботу на большай частцы Беларусі захаваецца сухое надвор'е, толькі ўдзень у асобных раёнах Гродзенскай, Віцебскай, Брэсцкай і на паўночным захадзе Мінскай абласцях чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Уначы будзе 4—9, удзень 17—22, на паўночным захадзе больш воблачна і толькі 14—16 градусаў. У нядзелю дажджы будуць гаспадарыць ужо на ўсёй тэрыторыі краіны. Пахаладае. Тэмпература ўначы — 3—9, удзень усяго 8—15 градусаў, толькі на паўднёвым усходзе яшчэ цёпла — 16—20 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9

Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Дата и время проведения аукциона	Окончательный срок подачи документов
1	Земельный участок с кадастровым номером 240100000002006384, площадью 0,0870 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Школьная, 28	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения. Ограничения в использовании земель: охранная зона линий, сооружений связи и радиофикации, охранная зона канализационного коллектора, санитарно-защитные полосы водоводов.	9 201 310	920 100 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет	28.10.2010 в 15.00	22.10.2010 до 17.30
2	Земельный участок с кадастровым номером 240100000002006336, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. Школьный, 10	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения. Ограничения в использовании земель: охранная зона канализационного коллектора.	15 945 600	1 594 500 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет	28.10.2010 в 15.00	22.10.2010 до 17.30
3	Земельный участок с кадастровым номером 240100000002006334 площадью 0,0729 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Школьная, 10	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения. Ограничения в использовании земель: охранная зона канализационного коллектора.	7 749 562	774 900 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет	28.10.2010 в 15.00	22.10.2010 до 17.30
4	Земельный участок с кадастровым номером 240100000002006396 площадью 0,0531 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Целинная, 56	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения. Ограничения в использовании земель: санитарно-защитная полоса водовода, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, охранная зона систем газоснабжения.	15 047 865	1 504 700 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет	28.10.2010 в 15.00	22.10.2010 до 17.30

Аукционы по продаже права заключения договора аренды земельного участка

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка, предлагаемого в аренду	Функциональное назначение земельного участка, срок аренды	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена права заключения договора аренды (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Дата, время и место проведения аукциона	Окончательный срок подачи документов
1	Земельный участок с кадастровым номером 240100000003006429, площадью 0,0104 га расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Энергетиков	Под строительство объекта «Объект розничной торговли по улице Энергетиков в г. Витебске». Срок аренды 25 лет.	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения и водоотведения, наличие телефонного и электрического кабеля. Ограничения в использовании: охранная зона линий, сооружений связи и радиофикации, охранная зона канализационного коллектора.	4 402 772	440 300 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет	29.10.2010 в 15.00	25.10.2010 г. до 17.30
2	Земельный участок с кадастровым номером 240100000002006397, площадью 0,0061 га расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Школьная	Под строительство объекта «Торговый объект по реализации товаров первой необходимости у дома № 1/23 по улице Школьной, в поселке Васьковичи». Срок аренды 5 лет.	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения, ливневой канализации, наличие телефонного кабеля. Ограничения в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий, сооружений связи и радиофикации.	357 991	35 800 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет	29.10.2010 в 15.00	25.10.2010 г. до 17.30
3	Земельный участок с кадастровым номером 240100000001009537, площадью 0,1050 га расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 6-я Суражская.	Под строительство объекта «Центр торговли и общественного питания по улице 6-й Суражской в г. Витебске». Срок аренды 25 лет.	Возможность подключения централизованного водосн

Крэдытныя кааператывы:

НЕАБХОДНЫЯ ГРОШЫ Ў ПАТРЭБНЫ ЧАС

Офіс ПТ «Спектр» сустракае наведвальнікаў сучасным дзелавым дызайнам.

ЧАС ЯК ГАЛОЎНЫ АРГУМЕНТ

— Калі людзі звоняць да нас і выказваюць недавер, то мы запрашаем іх у офіс і ў ходзе дыскусіі тлумачым, што наша дзейнасць не мае нічога агульнага з фінансавай пірамідай: яна празрыстая, мае іншыя мэты і механізмы, адпавядае заканадаўству і інтарэсам грамадства і накіраваная не на атрыманне прыбытку, а на эфектыўнасць, — кажа **старшыня праўлення «Таварыства ўзаемнага крэдытавання «Капітал-Інвест» і член праўлення Спажывецкага кааператыва «Спектр-Капітал» Аляксандр ГАНЧАРОЎ.** — Калі аргументацыі аказваецца недастаткова, тады мы адкладаем сустрэчу з гэтым чалавекам на пэўны час. Бо менавіта час пакажа, што крэдытныя кааператывы — цалкам надзейны і запатрабаваны фінансавы інструмент.

Узнікненне крэдытных кааператываў у Беларусі — вельмі значная для грамадства тэндэнцыя. Па сутнасці, сёння створана заканадаўчая магчымасць самафінансавання бізнэсу, якая пакуль слаба ім выкарыстоўваецца.

Тыя, для каго банкі недасягальныя або нецікавыя, могуць займацца самафінансаваннем сваёй справы, жыццядзейнасці, гаспадаркі. Для гэтага дастаткова аб'яднацца па тэрытарыяльнай, дзелавой або іншай прыкмеце, стварыць кааператыў і арганізаваць касу ўзаемадапамогі на пэўных умовах.

— Уступленне крэдытных саюзаў ПТ «Спектр» у Рэспубліканскую асацыяцыю спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі таксама павялічвае давер да іх з боку грамадства?

— Безумоўна, гэта здымае многія пытанні. Вельмі важна, што дзейнасць Асацыяцыі адобрана Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

Кожны вырашае для сябе сам: уваходзіць або не ўваходзіць у Асацыяцыю. Мы вырашылі ўвайсці, каб максімальна пазбегнуць памылак росту. Тое, што мы зараз перажываем, Асацыяцыя перажыла 8 гадоў таму, яе вопыт вельмі каштоўны, і мы зараз звяраем сваю прававую базу не толькі з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, але і з нарматыўнымі дакументамі Асацыяцыі.

НЕВЯЛІКІЯ ГРОШЫ НА КАРОТКІ ТЭРМІН

— Чым, на ваш погляд, прадыктаваная запатрабаванасць грамадства ў крэдытных кааператывах?

— Сёння беларусы, як усе еўрапейцы, жывуць па стандартах грамадства спажывання, а такое грамадства дыктуе неабходнасць мець дарагія аксесуары: машыны, дзелавыя касцюмы, летнікі і шмат чаго іншага. Вядома, кааператыў не закліканы іграць ролю фінансавай структуры, якая дапамагае забяспечваць атрыманне гэтых аксесуараў. Але крэдытны кааператыў дазваляе ўнесці ў тэрміновым парадку першапачатковы ўзнос, напрыклад, залогавы кошт аўтамабіля. А на наступны дзень вярнуць пазыку.

Крэдытныя кааператывы — гэта інструмент перахопу грошай, іх пазыкі або перапазыкі на тэрміновыя патрэбы. На такія патрэбы, на якія няёмка нават у калег па працы спытаць. Ды і не станеш кожны раз пытацца, каб выручылі з тым або іншым. А крэдытны кааператыў — гэта якраз такая палачка-выручалачка. Тут да ўсіх адносіны добразычлівыя: і да тых, хто прыносіць грошы, і да тых, хто прыходзіць за імі. Бо і першыя, і другія адзін аднаму карысныя. Чым больш людзей да нас прыходзіць, чым больш звяртаецца па пазыку, тым большай іх колькасці мы патрэбныя, і тым больш эфектыўна працуем.

Сваю місію мы бачым у тым, каб быць патрэбнымі для людзей, якім тэрмінова патрэбныя невялікія грошы.

Дызайнер Ірына ГАЙКОВІЧ (на фота справа) завітала ў ПТ «Спектр» з надзеяй вырашыць часовыя фінансавыя праблемы. Як бачыце, першая кансультацыя з супрацоўніцай Веранікай КАЛЕКА абяцае станоўчы вынік.

СУПРАЦОЎНІЦТВА ЯК ВЫШЭЙШАЯ ФОРМА КАНКУРЭНЦЫІ

— Як нарадзілася ідэя стварэння крэдытных кааператываў і іх аб'яднання ў Простае таварыства «Спектр»?

— Напэўна, першапачаткова гэта прыйшло з уласнага вопыту. Я — марак далёка-ўсходнік. Адзін з лепшых перыядаў майго жыцця адрозніваўся ў тым ліку і тым, што заўсёды, у любы момант, была магчымасць пазычыць грошы раніцай да поўдня, апоўдзень да вечара і вечарам да раніцы. Гэта палягчае жыццё.

Нядаўна ж я патрапіў у Беларусі ў сітуацыю, калі мне спатрэбіліся 10 тысяч долараў, і быў вымушаны разбіць гэту суму на дробныя кавалкі і звярнуцца не да аднаго чалавека, а да пятнаццаці, прычым не кожны гатоў быў мяне выручыць. Калі я цікавіўся, чаму мне адмаўлялі, то чуў пяць розных прычын. Па-першае, страчана традыцыя даверу. Па-другое, сямейны бюджэт у людзей невялікі. Па-трэцяе, узраслі ўласныя патрэбы. Калі чалавек некаму пазычыць 300 долараў, значыць, ён адмовіць сабе ў пакупцы смартфона або, скажам, не зможа парадаваць цешчу новым пыласосам, а жонку — кухонным камбайнам...

Калі я зразумеў, што, акрамя суб'ектыўных, ёсць аб'ектыўныя прычыны, па якіх людзі адзін аднаму адмаўляюць у кароткатэрміновых пазыках, то вырашыў, што настаў час Беларусі паглядзець на сферу фінансавых кааператываў. Я ўжо меў вопыт работы з такімі ў Расіі.

Тады мы прыйшлі ў Асацыяцыю (а я ўжо ведаў, што ў хуткім часе буду мець свабодныя грашовыя сродкі) і даведаліся, наколькі гэта запатрабавана ў Беларусі, як да гэтага адносіцца дзяржава, вывучылі дакументы і пралічылі, што ідэя мае добрую перспектыву.

— Пры ажыццяўленні ідэі чаго было больш: разумення або недаверу?

— Разумення. Мы ўпэўніліся, што нас падтрымліваюць і дзяржаўныя структуры, і банкі. Аб'яднаўшы дробных пазычальнікаў, мы самі сталі прывабным кліентам для банка. Мы цікавыя банку таму, што да нас увесь час паступаюць грошы, і ў нас ўвесь час вылучаюцца грошы, а банк зарабляе на камісіі.

Мы ведаем, што вельмі патрэбныя звычайным людзям, прыватным прадпрымальнікам, бізнэсменам. Напрыклад, чалавек, які гандлюе на рынку, даведаўся, што недзе ёсць стокавы тавар — тавар, які аказаўся незапатрабаваны, і які прадаецца за нізкую цану. Заўтра ён перапрадасць гэты тавар з прыбыткам для сябе, а сёння яму тэрміновa патрэбны грошы. Дык вось, гэты чалавек можа пазваніць да нас, ён можа разлічваць, што яго выслухаюць у зручны для яго час, напрыклад, увечары, і што яму своечасова пазычаць патрэбную суму.

Мы не баімся і канкурэнтнага асяроддзя. ***Апошняе адкрыццё рынкавага свету заключаецца ў тым, што вышэйшая форма канкурэнцыі — гэта супрацоўніцтва.*** Менавіта з гэтага пункта погляду мы сёння падыходзім да дзейнасці нашай арганізацыі. Чым больш арганізацый, падобных нашай, будзе створана ў Беларусі, тым большы будзе ад іх эфект. Ідэалам было б, каб крэдытныя кааператывы існавалі ў кожным райцэнтры, каб іх паслугай мог скарыстацца кожны вясковы жыхар.

Мы хочам, каб беларускае бізнэс-асяроддзе развівалася ў тым ліку і з нашай дапамогай. Каб мы былі адной з многіх кропак апоры, якіх у беларускай эканомікі павінна быць шмат.

Мы плануем стварыць крэдытныя кааператывы для людзей, якія падзяляюць прынцыпы Простага таварыства «Спектр». Няхай фінансавыя саюзы аб'ядноўваюць мастакоў, артыстаў, бізнэсменаў... Пайшчыкі будуць узаемна выручаць адзін аднаго, узаемна пазычаць грошы, і ім не трэба будзе думаць, якія ж прывесці аргументы, каб не адмовілі ў тэрміновай пазыцы.

— Ці можна разумець вашы словы як абрысы перспектыў ПТ «Спектр»?

— Пакуль Простае таварыства «Спектр» плануе аб'яднаць каля 20 арганізацый, таксама мы спадзяёмся, што ў крэдытныя саюзы ўвойдуць 200—300 арганізацый або 2-3 тысячы чалавек, якія будуць мець агульныя погляды.

Калі мы будзем правільна развівацца разам з іншымі крэдытнымі саюзамі, то грамадства гэта ацэніць. Калі ў нашы крэдытныя кааператывы увойдзе 2-3 тысячы грамадзян, якім мы дапаможам стварыць свабоднае дзелавое асяроддзе, то ўсе ад гэтага выйграюць.

ДАПАМАГЧЫ МОЦНАМУ

— Каму больш важна дапамагчы: грамадзяніну, якому тэрміновa трэба ўнесці залогавы кошт за аўтамабіль, або прадпрымальніку, які развівае свой бізнэс?

— Магчымасць тэрмінова атрымаць грошы пазбаўляе ад унутранага напружання. Пагадзіцеся, гэта аднолькава важна і ў бізнэсе, і ў асабістым жыцці. Разам з тым я лічу, што дзелавы чалавек мае ў наш час асаблівую місію, ён падобны лакаматыву ў эканоміцы, бо рынкавае грамадства трымаецца на прыватнай ініцыятыве такіх людзей. Менавіта яны бяруць на сябе рызыку, не спяць начамі, нараджаюць новыя ідэі, робяць выбар.

З усёй адказнасцю заяўляю: сёння стартавыя ўмовы для бізнэсу ў Беларусі вельмі цікавыя. І яны значна лепшыя, чым у Расіі.

Я ўжо шмат часу знаходжуся ў бізнэсе. З 1992 года пастаўляў у Беларусь прадукцыю металапракату, з 1993 па 1998-ы працаваў тут. У свой час скончыў завочны фінансава-эканамічны інстытут, мая навуковая работа была прысвечана інвестыцыям. ***Дык вось, прыцягнуць інвестараў для развіцця сярэдняга і малога бізнэсу — задача надзвычай цяжкавыканальная, але наша доўгатэрміновая дзейнасць па прадстаўленні кароткатэрміновых пазык мае эфект доўгатэрміновых інвестыцый.***

Паўтару: мы не імкнёмся быць выключнымі, унікальнымі. Але мы не баімся сказаць, што хацелі б быць прыкладам. І ў нечым ужо такімі з'яўляемся. Калегі нам кажуць: мы хочам павучыцца ў вас смеласці ў прыняцці рашэнняў, вы не пабаяліся ўзяць адказнасць за вялікія грашовыя сродкі. І я кажу: мы хочам кожнаму перадаць адказнасць за сваё жыццё і дзейнасць. Толькі ў такім выпадку чалавек сцвярджаецца як чалавек. Наша задача — дапамагчы менавіта моцным людзям, тым, якія не баяцца браць на сябе адказнасць.

— Смеламу патрэбна падтрымка, а моцнаму — дапамога?

— Так. Яшчэ адна жыццёва неабходная якасць для сучаснага чалавека — удзячнасць. Мы забываем дзякаваць нашым бацькам, Бацькаўшчыне, грамадству... Усім, каму абавязаны тым, што маем, і тым, якія мы ёсць.

Сучасны чалавек павінен быць больш чуллівы і больш клапатлівы. Так, свет яго прымушае быць канкурэнтажорсткім, але пры гэтым вельмі важна заставацца чалавечным і высакародным.

Вось і я хачу выказаць падзяку нашым партнёрам, супрацоўнікам і калегам, усім, хто стаў членам Таварыства і крэдытных кааператываў, і тым, хто жадае ім стаць. Мы ўсіх запрашаем, усіх чакаем.

Асаблівая ўдзячнасць тым, хто нас падтрымлівае на сённяшнім пачатковым для нас этапе — гэта Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белдзяржстрах», Рэспубліканская асацыяцыя спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі, ЗАТ «Цэптэр Банк» і ААТ «Тэхнабанк».

Многім, хто патэлефанаваў сюды з пытаннямі пра грашовы заём, знаёмы ветлівы голас кансультанта Марыны КАЛЕСНІК.

Карысны адрас:

г. Мінск,
пр-т Незалежнасці, 117а,
«Аляксандраў Пасаж»,
15 паверх,
офісная частка комплексу
(уваход з боку вул. Філімонава)
Тэл.: 266 26 99,
(044) 766 26 99,
(029) 556 26 99
www.spektr.by
ПТ «Спектр-Капітал»

УНП 191307917

Пасведчанні Рэспубліканскай асацыяцыі спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі — своеасаблівы наказ маладому калектыву на паспяховую дзейнасць.

Філіял «Тэхнабанка» ў Мінску, цэнтр банкаўскіх паслуг № 541. Начальнік цэнтра Марына АЎЧЫННІКАВА ведае ў твар многіх кліентаў ПТ «Спектр». Менавіта ў гэтым цэнтры хутка і найбольш зручна можна атрымаць грошы па заёме.

Ад пачатку запаўнення афіцыйных бланкаў да выдачы патрэбнай сумы грошай пройдзе некалькі гадзін.

Ганна ЛАСІЦА, уладальніца фітнэс-клуба FORMANN:

«У БАНКУ РАЗГЛЯДАЮЦЬ ПАПЕРЫ, А ТУТ З ТАБОЙ РАЗМАЎЛЯЮЦЬ».

Ганна Ласіца — адна з пайшчыкаў крэдытнага кааператыва «Капітал-Інвест». Тэрміновыя грошы ёй былі настолькі патрэбныя, што яна напаўжартоўна кажа: «Мае думкі проста матэрыялізаваліся ў выглядзе ПТ «Спектр».

— Я ўваходжу ў Саюз прадпрымальнікаў, адтуль і даведалася пра магчымасць хуткай пазыкі грошай, — расказвае Ганна. — Мая фірма існуе паўтара года, і на мой погляд, «Спектр» прапануе дастаткова добры выхад для развіцця бізнэсу.

Напрыклад, мне, каб пашырыць свае паслугі, трэба стварыць новыя працоўныя месцы, а для гэтага неабходна купіць новае абсталяванне. Умовы пакупкі такія, што найбольш выгадна запляціць як мага хутчэй. Як кажуць — учора. А для гэтага мне патрэбныя 26 мільёнаў беларускіх рублёў. Калі я не ўнясу грошы зараз, то потым новае абсталяванне абыдзецца мне значна даражэй: гэта звязана з транспарціроўкай, камплектацыяй заказу. Мае выдаткі па пазыцы не ідуць ні ў якое параўнанне з тым, колькі грошай я магу згубіць, калі своечасова не аплачу заказ.

«Спектр» мне вельмі дапамог: сёння я звярнулася сюды, а заўтра ўжо атрымаю грошы. Збор дакументаў таксама не заняў шмат часу: раніцай я пазваніла ў «Спектр», а апоўдні ўжо прыйшла з пакетам патрэбных даведак.

Да таго ж, тут вельмі лаяльна падыходзяць да пытання пагашэння пазыкі, распытваюць пра твае магчымасці, уважліва выслухоўваюць. Я сама складала графік пагашэння, зрабіла яго для сябе найбольш зручным. У банку разглядаюць паперы, а тут з табой размаўляюць. Падыход сапраўды індывідуальны.

— Наконт лаяльнасці, — тлумачыць Юрый Сацута. — У нас у прынцыпе, калі падпісваецца дагавор, складаецца графік пагашэння, які ўзгадняецца з пазычальнікам. Але бываюць такія выпадкі, калі па графіку трэба плаціць на 10 дзень пэўнага месяца, а грошы паступяць на разліковы рахунак толькі ў 15-ты. Тады можна прыйсці ў кааператыў, патлумачыць абставіны, напісаць заяву і пагасіць частку пазыкі 15-га числа. Ніякіх штрафных санкцый у гэтым выпадку прымяняцца не будзе. Але калі ў заяве напісана, што грошы будуць 15-га, то яны павінны быць 15-га.

Сусветная і беларуская практыка паказваюць, што члены кааператыва звяртаюцца па пазыку неаднаразова. Гэтак жа неаднаразова яны і размяшчаюць свае свабодныя сродкі. Для актыўных удзельнікаў мы ў далейшым прадугледжваем яшчэ больш мяккія ўмовы пагашэння пазыкі.

Ірына ГАЙКОВІЧ, дызайнер мужчынскага і жаночага адзення Sofit Gy:

«ІНШАЙ МАГЧЫМАСЦІ АТРЫМАЦЬ ГРОШЫ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ БІЗНЭСУ Ў МЯНЕ НЕ БЫЛО».

Ірына Гайковіч — новае імя ў свеце моды. Але, з пункту погляду падатковага заканадаўства, яна пакуль з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, плаціць адзіны падатак і не мае разліковага рахунку. Таму банкі адмаўляюць таленавітаму дызайнеру ў крэдыце.

— Я нічым не магу пацвердзіць свой прыбытак, а значыць не магу ўзяць крэдыт як юрыдычная асоба, — расказвае яна. — А эфектыўная стаўка па спажывецкім крэдыце ў банках вышэйшая, чым тут. Праблема яшчэ ў тым, што я не з'яўляюся грамадзянкай Беларусі.

Я займаюся канструяваннем і шыццём мужчынскага і жаночага адзення, са сваімі вырабамі зараз выходжу на маскоўскі рынак, пастаўляю эксклюзіўнае адзенне ў буцікі. У мяне ёсць свой брэнд, які ведаюць заможныя жыхары Масквы. Для таго, каб прапаноўваць новыя вырабы, мне неабходна закупіць новыя тканіны і матэрыялы.

Таму я і прыйшла ў «Спектр», рэкламу якога ўбачыла ў метро. Бяру тут пазыку на 9 млн беларускіх рублёў пад 4 працэнты ў месяц тэрмінам на тры месяцы. Гэтыя ўмовы мяне цалкам задавальняюць. Штомесяц я буду вяртаць прыкладна па тры мільёны, а мая пераплата праз тры месяцы складзе прыкладна 680 тысяч беларускіх рублёў. Але я намерана вярнуць пазыку раней, а значыць і пераплата будзе меншай.

Самае складанае для мяне было знайсці двух паручыцеляў, для гэтага спатрэбіўся тыдзень. Усё астатняе не выклікала ніякіх праблем. Аднак гэта было адзінай магчымасцю знайсці патрэбную мне суму.

Упэўненая, што «Спектр» зойме сваю нішу, бо такіх індывідуальных прадпрымальнікаў, як я, шмат, і ім часта бываюць патрэбныя хуткія і параўнальна невялікія грошы. Да сённяшняга дня ў іх была адна магчымасць — пазыка ў знаёмых. Але не ўсе знаёмыя гатовы пазычаць грошы для развіцця твайго бізнэсу, нават калі яны ў іх ёсць.

ЛЮДЗІ НОВАЙ ФАРМАЦЫІ

Так ахарактарызавала стваральнікаў крэдытных кааператываў **начальнік Цэнтра банкаўскіх паслуг № 541 Філіяла ААТ «Тэхнабанк» у Мінску Марына АЎЧЫННІКАВА.** І адказала «Звяздзе» на некалькі пытанняў на гэту тэму.

— Чым Простае таварыства «Спектр» цікавае Тэхнабанку?

— Сёння ўсе банкі зацікаўленыя ў добрым кліенце. «Спектр» як укладчык цікавы банку таму, што да яго прыйдуць добрыя рэсурсы, якія паступяць на банкаўскі рахунак і будуць знаходзіцца там да таго часу, пакуль іх не размесцяць у інакшыя ўклады. Да таго ж, банк, дзякуючы дзейнасці «Спектра», павялічвае колькасць сваіх валютна-абменных і іншых аперацый.

Але самае прыемнае тое, што ў Таварыства ўваходзяць людзі новай фармацыі. Крэдытныя саюзы «Спектра» вельмі эфектыўна развіваюцца. Па-сутнасці, яны займаюцца падтрымкай людзей, і гэта пазіцыя супадае з той, якую зараз займае банк. У аснову нашага Цэнтра банкаўскіх паслуг пакладзены прынцып супрацоўніцтва, гэтага прынцыпу трымаецца і Таварыства.

Пацвярджэннем зацікаўленасці Тэхнабанка ў гэтым кліенце з'яўляецца прыняцце рашэння пра змяншэнне тарыфаў на паслугі для спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі.

— Ці праўда, што крэдытныя кааператывы не ствараюць канкурэнцыю банкам?

— Я б не стала казаць стуль адназначна. Да таго часу, пакуль ніша мікрафінансавання не дастаткова распрацаваная, крэдытныя кааператывы не складаюць канкурэнцыю банкам. Банку для выдачы крэдыту патрэбны даволі вялікі пакет дакументаў, ён праводзіць вельмі сур'ёзную праверку, якая рэгламентуецца і Нацыянальным банкам, і цэлай гарой інструкцый. На ўсё гэта патрэбны час. Так, некаторыя банкі даюць мікракрэдыты на працягу дня, але яны могуць і адмовіць без тлумачэння прычын. Банкі — вельмі кансерватыўныя ўстановы, цалкам адпавядаць іх патрабаванням бывае няпроста.

Функцыя, якую выконваюць спажывецкія кааператывы фінансавай узаемадапамогі, падобная на тую, што ў савецкія часы выконвала агульная каса. Раней грошы збіралі ўсім аддзелам, і кожны мог імі скарыстацца, калі ўзнікала патрэба: вяселле, наваселле і г.д.

Крэдытныя кааператывы канкурэнцыю банкам не складаюць, бо іх інтарэсы пакуль не перакрыжоўваюцца. Але, калі фінансавыя кааператывы разрастуцца да той ступені, у якой яны існуюць за мяжой, тады, магчыма, банкам прыйдзецца думаць, якім чынам паляпшаць свае ўмовы па крэдытах і ўкладах.

— Наколькі супрацоўніцтва банка з крэдытным кааператывам сведчыць пра надзейнасць апошняга?

— Пытанне аб надзейнасці падобных фінансавых арганізацый узнікае ў многіх. Я сама падняла вельмі шмат дакументаў, каб вызначыць для сябе, што сабой уяўляюць крэдытныя кааператывы. Прапанова шырокага супрацоўніцтва заўсёды мае на ўвазе дасканалае даследаванне дзейнасці партнёра.

Асабіста ў мяне з самага пачатку ўзнікла пытанне наконт ліцэнзіі. Нацыянальны банк на наш запыт патлумачыў, што дзейнасць, пры якой выдача пазык сваім удзельнікам ажыццяўляецца за кошт уласных сродкаў арганізацыі, як у выпадку з крэдытнымі кааператывамі, не ліцэнзуецца.

Такая дзейнасць рэгулюецца Грамадзянскім кодэксам і Пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Мы падняліўсе Пастановы, вывучылі ўстаноўчыя дакументы Таварыства, даведаліся пра спажывецкія кааператывы фінансавай узаемадапамогі ўсё, з самага пачатку іх утварэння. І магу сказаць, што як кліент Таварыства ў мяне не выклікае ніякіх адмоўных асацыяцый. Наадварот, супрацоўніцтва з ім ужо дае плён.

У нас маецца Ліст Нацыянальнага банка, у якім усхваляецца дзейнасць Асацыяцыі спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі. У гэтым Лісце сказана, што дзейнасць Асацыяцыі ў накірунку развіцця крэдытнай кааперацыі «цалкам адпавядае мэтам і задачам, якія сёння вырашаюцца ў рамках рэалізацыі сумеснага праекта Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь і Праграмы развіцця ААН «Садзейнічанне развіццю мікрафінансавання ў Рэспубліцы Беларусь».

Асабіста мне сімпатызуе і тое, што кожны член кааператыва мае права кантраляваць яго дзейнасць. Уся дзейнасць фінансавага саюза павінна быць празрыстай і зразумелай. І сапраўды, поўная інфармацыя пра «Спектр-Капітал» і «Капітал-Інвест» ёсць на сайце ПТ «Спектр». Крэдытны кааператыў тым і адрозніваецца, што грошы пазычаюцца толькі ягоным членам, і кожны з членаў можа ў любы час прыйсці і спытаць: куды пайшлі мае грошы? З майго пункта погляду, гэта вельмі сур'ёзная рэч. Банк, хоць і публікуе поўную справаздачу пра сваю дзейнасць, але гэтакі канкрэтны адказ на падобнае пытанне вы знойдзеце ў ім не заўсёды.

Вельмі значна і тое, што дадзеныя крэдытныя кааператывы агучваюць адразу эфектыўную стаўку, яны не маюць «напісаных дробным шрыфтам» камісій.

Гэта што датычыцца надзейнасці кліента банка. Што тычыцца даверу насельніцтва — то кожны сам выбірае: каму даручыць і ў каго пазычыць грошы.

Матэрыял падрыхтавалі Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Віктар ПАЗНЯКОЎ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Услед за пісьмом

«ЧАМУ Ў БАРЫСАВЕ ЭКАНОМЯЦЬ НА ВЕТЭРАНАХ?»

ТАКІМ пытаннем пачынаецца ліст, які прыйшоў у рэдакцыю «Звязды» ад удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, інваліда 2 групы Віктара Емяльянавіча АСТАШКІ з Барысава.

«Я жыву ў мікрараёне Лядзішчы, у доме № 31 па вуліцы Дняпроўскай. Ніколі не думаў, што прыйдзе час, калі мясцовыя чыноўнікі і службы ЖКГ будуць эканоміць грошы на ветэранах, і не толькі эканоміць, але і забіраць у іх.

Пасля чарговага касога дажджу я сяджу на кухні на кукішках з анучай і тазікам — збіраю ваду, якая цячэ па сценах. Удвая крыўдна, што гэта адбываецца пасля рамонту кватэры, якую адрамантавалі да свята зусім не за кошт гарадскога бюджэту. А да гэтага моманту дажджом замкнула электрашчыт у пад'ездзе, і ў мяне знікла электрычнасць. Усё гэта адбываецца з-за «эканоміі» на рамонце даху і стыкаў сценавых панэляў. Рамонт даху рабілі капітальны толькі на паперы, а насамрэч атрымаўся «цякучы» (працякаючы) — з іржавым старым парапетам, прыбітым іржавымі цвікамі проста ў бетон... Міжпанэльныя швы замазалі толькі з фасада дома, таму з супрацьлеглага боку цячэ не толькі ў мяне, але і ў іншых жыльцоў дома.

Па прызнанні камунальных службаў з жыльцоў дома за чатыры гады незаконна ўтрымалі за ацяпленне больш за шэсць мільёнаў рублёў, і калі дадаць сюды яшчэ і «эканомію» на рамонце даху, атрымаецца сума, па якой трэба шукаць артыкул у Крымінальным кодэксе. І куды толькі не звярталіся жыльцы, але аб'ектыўныя праверкі абходзяць Барысаў бокам.

...Перажылі вайну і хочацца дастойна дажыць у мірны час. І калі б былі адпаведны клопат і адносіны да нас з боку мясцовых чыноўнікаў, жыць было б значна лягчэй, тым больш мы гэта заслужылі».

Карэспандэнт «Звязды» накіравалася ў госці да Віктара Емяльянавіча. За кубачкам гарбаты ветэран у чарговы раз, але ўжо больш эмацыйна, чым у лісце, распавёў сваю «мокрую» гісторыю...

— Першы раз кухню, ванну і прыбіральню заліло летась, у жніўні. Усё — і столь, і сцены скрозь — было чорнае. Напісаў заяву — прыйшла жанчына, паглядзела на мой «патоп» і паабяцала прысласць людзей. Праз колькі дзён я паехаў у Бараўляны ў шпіталь. Вяртаюся — нічога не зроблена. Толькі ў лістападзе прысласлі хлопца, які на люльцы збольшага памахаў памазком. Я спытаў: «Сынок, а хто будзе бяліць столь і сцены?» Ён толькі паціснуў плячыма.

Вясной, паводле слоў Віктара Емяльянавіча, «патоп» паўтарыўся. Па заяве прыехалі тры спецыялісты, убачылі лужыну пасярод кухні і сказалі, што трэба прымаць меры. Пакуль яны думалі, Чарняўскі Мікалай Мікалаевіч — дырэктар «Бытсэрвісу», дзе я прарабіў 20 гадоў, — даведаўшыся пра маю бяду, прыслаў прараба, які ў лічаныя дні прывёў у парадак мне ванну, прыбіральню і кухню. З мяне ні капейкі не ўзялі. Вось гэта адносіны да ветэрана, дай Бог кожнаму б так!

Апошні раз касы дождж даў пра сябе знаць у пачатку верасня. Ва УП «Жыллё» сцвярджаюць, што ў сераду (8 верасня) прыязджалі спецыялісты і паўторна замазалі швы. Але Віктар Емяльянавіч толькі паціскае плячыма.

— Не ведаю, я і ў сераду, і ў чацвер быў дома, нікога не бачыў... Са страхам чакаю чарговага дажджу. Што мне рабіць, калі зноў затопіць?.. Ведаеце, я б і не пісаў у газету, калі б не словы намесніка дырэктара УП «Жыллё» (маўляў, атрымаў дапамогу напярэдадні Дня Перамогі, няхай на гэтыя грошы і робіць рамонт). Я тады не вытрымаў і напісаў у газету. Кожны ж месяц плачу 14 тысяч за капітальны рамонт. А што мне зрабілі? Няякасны капітальны рамонт...

Неўзабаве размова плаўна перацякла ў крыху іншае, але не менш важнае, рэчышча.

— Я з 1932-га па 1940 год жыў у дзетдоме, — кажа Віктар Емяльянавіч. — Як зараз памятаю, за кожным класам былі замацаваныя старыя, якія прымалі ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі. Зараз нас у Лядзішчах засталося 10 ветэранаў. Школа ў двух кроках знаходзіцца, але там пра нас узгадалі толькі на Дзень Перамогі. А раней, памятаю, мяне запрашалі выступіць перад вучнямі па некалькі разоў на год...

— Можна дзесяць чалавек клопатам акружыць, — не вытрымаў Уладзімір Ціханаў, сусед Віктара Емяльянавіча. — Не трэба штодзень. Але хоць бы раз на месяц патэлефанаваць, спытацца, мо трэба дапамога. Усялякае можа стацца. Напрыклад, як зараз: затапіла, а нікому і справы няма.

— Усё залежыць ад таго, як паставіць пытанне кіраўніцтва, — лічыць Віктар Емяльянавіч — Са мной у шпіталі ляжаў чалавек з Нясвіжа. Дык ён расказваў, што іх старшыня райвыканкама, калі прыязджае ў калгас, то не праміне аб'ездзіць усе палі. Яго ў раёне ўсе ведаюць...

— Вось і сёння хоць бы адзін чалавек з адміністрацыі прыехаў, — дадае Уладзімір Ціханаў.

— Як той казаў, плюй на ўсё — беражы здароўе, — уздыхнуў Віктар Емяльянавіч і, падзякаваўшы за тое, што не праігнаравалі яго ліст, праводзіў мяне да дзвярэй.

Віктар Емяльянавіч, як высветлілася пазней, папярэдзіў суседзяў пра мой прыезд. У адзінаццаць гадзін перад пад'ездам сабраліся пенсіянеры, і кожны пачаў расказваць пра свае балячкі: у каго балкон у аварыйным стане, у каго з гарачай вадой праблемы, у каго ў пад'ездзе на працягу двух гадоў (!) стаяць вёдры на выпадак дажджу... Усё Наталля Скуратовіч, начальнік ЖЭА-3, якая таксама знайшла час, каб сустрэцца з жыльцамі, узяла на аловак і паабяцала прысласць людзей і разабрацца.

КАМЕНТАРЫ

1. Віктар САКОВІЧ, намеснік старшыні Барысаўскага райвыканкама, дэпутат Мінскага абласнога Савета дэпутатаў па Барысаўскай Лядзішчанскай акрузе:

«ГАЗЕТА Ж НЕ ПРЫЕДЗЕ БЯЛІЦЬ СТОЛЬ...»

— Больш за 70 працэнтаў зваротаў, якія паступаюць ад жыльцоў мікрараёна Лядзішчы, тычацца жыллёва-камунальных пытанняў. І гэта зразумела, бо дамы, перададзеныя ў камунальную ўласнасць Міністэрствам абароны, сапраўды, патрабуюць сур'ёзных грашовых укладанняў. Для зняцця сацыяльнай напружанасці ў гэтым рэгіёне, па папярэдніх падліках, неабходна правесці рамонтныя работы на суму больш як 25 мільярдаў рублёў (!). У адзін момант, па зразумелых прычынах, адрамантаваць увесь фонд мы не маем магчымасці. Таму праводзім капітальны і бягучы рамонт паступова, у першую чаргу там, дзе ён найбольш неабходны. Жыльцам дома, дзе пражывае ветэран, я б сказаў, вельмі пашанцавала. Каму-каму, але не ім бы скардзіцца. Там адрамантавалі дах, пад'езды, адмосткі, прыступкі ўваходных груп, замазалі міжпанэльныя стыкі... Ніхто не адмаўляе, што ў працэсе эксплуатацыі могуць выяўляцца нейкія хібы, пра якія кожны жылец мае права заявіць. Калі будзе ўстаноўлена наша віна, то ўсе недаробкі адназначна будуць ліквідаваныя. Гэта звычайная практыка, і нічога тут новага няма. Што тычыцца нашага ветэрана, то ён аса-

2. Таццяна БУЦЕНАС, начальнік упраўлення капітальнага і бягучага рамонту і арэндных адносінаў Барысаўскага ўнітарнага прадпрыемства «Жыллё»:

«БУДЗЕ ТЭХЗАКЛЮЧЭННЕ — ЗРОБІМ УЦЯПЛЕННЕ ФАСАДА»

— У доме 31, што на вуліцы Дняпроўскай, у маі гэтага года зрабілі рамонт міжпанэльных стыкаў на суму 10,4 млн рублёў. Жыльцы, здаецца, задаволеныя, вось толькі ў кватэру Віктара Емяльянавіча Асташкі вада працягвае прасочвацца нават пасля рамонту. На днях мы накіравалі рамонтную арганізацыю «Буд-вест», каб яна паўторна прамазала швы, але ўжо масцікай іншай маркі. Дало гэта эфект ці не — пакажуць дажджы. У крайнім выпадку дачакаемся мінусавай тэмпературы і запросім спецыяльную арганізацыю для правядзення абследавання на цеплаправоднасць сцен. Калі будзе адпаведнае тэхзаключэнне, то на наступны год унясём кватэру ветэрана ў спіс на бягучы рамонт па ўцяпленні.

Акрамя таго, у гэтым доме ў 2005 годзе зрабілі капітальны рамонт даху на суму 29 мільёнаў рублёў, сёлета ў ліпені часткова тынкавалі вентканалы (на суму 1,2 мільёна рублёў). Да нас звярнуліся жыльцы са скаргай, што падчас дажджу ў іх падцякаюць пад'езды і асобныя кватэры. Як высветлілася, прычына ў дзвюх варонках на даху, якія трэснулі. На днях мы задаволім заяву жыльцоў і памяняем гэтыя варонкі. Але патрабаванні жыльцоў не заўсёды рэальныя. Адзін жыхар гэтага дома на днях мне заявіў, што ён перастане скардзіцца, толькі калі мы зробім цынкавыя парапеты. Зрабіце і ўсё. Яго не хвалюе, дзе браць на гэта грошы і што ў жыхароў іншых дамоў маюцца больш сур'ёзныя праблемы...

3. Ірына ЧЫКАНКОВА, галоўны інжынер УП «Жыллё»:

«АДДЗЕЛ ПА БАРАЦЬБЕ З ЭКАНАМІЧНЫМІ ЗЛАЧЫНСТВАМІ НЕ МАЕ ДА НАС ПРЭТЭНЗІЙ»

— Даўным-даўно, калі яшчэ ўстанаўліваліся прыборы ўліку сістэмы ацяплення, да шматкватэрнага дома № 31 памылкова падключылі чатыры дамкі, якія размяшчаюцца насупраць. Памылку выявілі і знялі тыя прыборы ўліку. У гэты ж перыяд — 2008 год — Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі былі ўнесены змены ў інструкцыю аб аплаце за ацяпленне. Згодна з новым правілам, прыбор уліку, які стаіць на групу дамоў, не з'яўляецца камерцыйным. У сувязі з гэтым мы зрабілі пераразлікі жыльцам у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам не па прыборы ўліку, а па нарматывах. Вярнулі ім грошы, але асобныя жыльцы працягваюць абвінавачваць нас у крадзяжы, нават пасля шматлікіх праверак, якія прыязджалі да нас па іх скаргах. Вы ж самі падумайце, Аддзел па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі не мае да нас прэтэнзій, а жыльцы маюць...

* * *

Перад тым, як здаваць публікацыю ў друк, я паўторна размаўляла па тэлефоне з работнікамі УП «Жыллё» і суседам Віктара Емяльянавіча Уладзімірам Ціханавым.

«Усё, што напісана ў лісце, няпраўда. На месца выязджаем па першым званку. Проста гэта дом праблемны і жыльцы на публікацыі ў газеце не спыняцца. Што тычыцца ацынкоўкі, то яна была нармальная, але капітальны рамонт даху рабілі пяць гадоў таму. Дождж, снег, зразумела, аказалі на яе ўздзеянне. Зараз мы не бачым сэнсу яе мяняць. Мы клапоцімся, наколькі нам гэта дазваляюць сродкі, пра ўсіх жыльцоў, у тым ліку і пра ветэранаў. Дзве варонкі на даху, як і абяцалі, памянялі. Зараз ідуць работы па цеплаізаляцыі трубаправодаў».

Сусед жа папрасіў: «Толькі, калі можна, не згладжвайце вострых рагоў. Няхай адміністрацыя кажа, што мы ўсё прыдумляем. Але мы за сваё будзем змагацца да канца. Калі тут праўды не даб'ёмся, дык паедзем з Віктарам Емяльянавічам шукаць яе ў Мінск...»

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Замежныя эксперты скептычна ацэньваюць шанцы беларускай апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах

ГОНКА ЗАЎСЁДЫ ТОІЦЬ ІНТРЫГУ, АЛЕ ФАВАРЫТ ВІДАВОЧНЫ

Перадвыбарная прэзідэнцкая гонка, што стартавала ў Беларусі, выклікала ўсплёск журналісцкай актыўнасці дзякуючы ўсім вядомым акалічнасцям, звязаным з ёй. Але сур'ёзныя эксперты не чакаюць ад яе сенсацый. Замежныя аналітыкі адзначаюць, што пазіцыі дзейнага Прэзідэнта Беларусі з'яўляюцца трывалымі, чаго не скажаш аб іншых патэнцыяльных прэтэндэнтах, і няма падстаў меркаваць, што сітуацыя да дня галасавання неяк сур'ёзна зменіцца.

Назначаныя парламентам на 19 снежня 2010 года выбары некаторыя расійскія СМІ паспяшаліся вызначыць як «датэрміновыя», што абсалютна не адпавядае рэчаіснасці і проста прызначана прыправіць журналісцкія матэрыялы сенсацыяй і ажыятажам. Па Канстытуцыі выбары павінны былі адбыцца не пазней як 6 лютага 2010 года — так яно і будзе. З некалькіх магчымых варыянтаў даты была выбрана тая, што зручная насельніцтву: да пачатку шэрагу святаў, канікулаў, студэнцкай сесіі, лютых маразоў і звязаных з гэтым захворванняў.

Спробы адшукаць у гэтым выбары нейкі тайны сэнс — пустая трата часу. З палітычнага пункту гледжання не мае значэння, адбудзецца галасаванне да Новага года або пасля яго. Цана на расійскі газ, якую спрабуюць увязаць з тэмай выбараў некаторыя СМІ, пасля 1 студзеня рэвалюцыйна не зменіцца, паколькі вызначаецца кантрактам, тэрмін дзеяння якога заканчваецца толькі да 2012 года. «Кантракты па газу паміж «Газпрамам» і «Белтрансгазам» падпісаны ў 2007 годзе на пяцігадовы перыяд, уключаючы 2011 год», — растлумачыў журналістам пасол РФ у Мінску Аляксандр Сурыкаў.

Калі навагодні газавы канфлікт у Расіі і ўзнікне, то, хутчэй за ўсё, не з Беларуссю. Ён можа быць, напрыклад, з Украінай, калі ўрад Мікалая Азарава зробіць рашучыя крокі па пераглядзе кантрактаў з «Газпрамам», якія ён лічыць вельмі нявыгаднымі для Кіева. Праблемы могуць быць з Польшчай, дзе цяпер з-за пазіцыі Еўракамісіі заблакавана падпісанне новага пагаднення з Расіяй па пастаўках газу. Або з Літвой, якая збіраецца рэарганізаваць сваю газавую галіну без аглядкі на пазіцыю Масквы.

Падлікі колькасці тыдняў, якія застаюцца ў тым ці іншым выпадку на раскрутку прэтэндэнтаў, таксама не выклікаюць нічога, акрамя ўсмешкі. Няўжо нехта сур'ёзна лічыць, што лішнія тры-чатыры тыдні інфармацыйнай кампаніі могуць змяніць перавагі выбаршчыкаў? Беларускі выбаршчык гадамі фарміруе сваё стаўленне да таго ці іншага палітыка, таму патэнцыяльным кандыдатам трэба было пачаць аб рабоце з электаратам некалькі гадоў таму, а не месяцаў або тыдняў. За перадвыбарныя дні нельга змяніць ні сваю біяграфію, ні пералік асабістых дасягненняў і заслуг перад людзьмі — а менавіта на гэтыя фактары беларускі электарат арыентуецца больш, чым на прыгожыя словы і яркія агітацыйныя матэрыялы.

Ды і чаго граху таіць, праекты па сваёй раскрутцы многія прэтэндэнты запусцілі задоўга да фармальнага пачатку выбарчай кампаніі. Адзін з іх яшчэ зімой на прэзентацыях пачаў рабіць намёкі, што нейкія «сур'ёзныя людзі» прапануюць яму ісці ў прэзідэнты. Іншы заявіў аб сваіх прэзідэнцкіх амбіцыях у пачатку сакавіка ў эфіры польскага тэлеканала. Таму іх перадвыбарная агітацыя стартавала ўжо даўно, і на недахоп часу скардзіцца не даводзіцца.

Між іншым, беларускую апазіцыю, калі меркаваць па размовах яе прадстаўнікоў, больш турбуе бюджэт выбарчай кампаніі, чым яе вынік (у якім яны і самі ў глыбіні душы не сумняваюцца). «У нас няма сродкаў, каб процістаяць выбарчай машыне А. Лукашэнкі», — скардзіцца Саннікаў, які заявіў аб сваіх прэзідэнцкіх амбіцыях. «Для правядзення сапраўднай паўнацэннай кампаніі з прыцэлам перамагчы патрэбны каля 20 мільёнаў доларaў», — паўтарае іншы прэтэндэнт Някляеў, які нядаўна прызнаўся, што грошы на выбарчую кампанію атрымаў ад нейкіх замежных бізнэсменаў.

Менавіта таму замежныя эксперты, якіх з улікам іх заяў апошнія гады ніяк не западозрыш у сімпатыях да Аляксандра Лукашэнкі, катэгарычныя ў сваіх ацэнках: у беларускай апазіцыі няма шанцаў перамагчы на гэтых выбарах.

«Шанцаў у апазіцыі на выбарах няма», — лічыць намеснік дырэктара Інстытута краін СНД (Масква) Уладзімір Жарыхін. Ён няма чаго прапанаваць акрамя крытыкі дзейнага прэзідэнта. «Як толькі справа даходзіць да праграмы — агульныя словы аб еўрапейскім выбары Беларусі пры захаванні добрых адносінаў з Расіяй», — адзначае эксперт.

Лукашэнка карыстаецца вынікамі сваёй папярэдняй палітыкі ў сацыяльнай сферы, і гэта ўмацоўвае яго пазіцыі, лічыць гендырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра па вывучэнні грамадска-палітычных працэсаў на постсавецкай прасторы МДУ Аляксей Уласаў.

«На гэты момант перавага Лукашэнкі значная, рэйтынг у яго ёсць, таму шанцы Лукашэнкі на перавыбранне дастаткова высокія», — прагназуе дырэктар Міжнароднага інстытута палітычнай экспертызы Яўген Мінчанка.

«У беларускага Прэзідэнта па-ранейшаму няма ніводнага больш або менш сур'ёзнага супернікa, — прызнае галоўны рэдактар часопіса «Россия в глобальной политике» Фёдар Лук'янаў. — Лукашэнка пойдзе на выбары, каб выйграць, і пакуль няма прычын, якія маглі б яму перашкодзіць».

Усе свае надзеі беларуская апазіцыя будуе на непрызнанні вынікаў выбараў за мяжой і спробе аспрэчыць іх шляхам вулічных беспарадкаў. Але нават калі вынесці за дужкі той факт, што беларусы не маюць патрэбу ў адабрэнні або неадабрэнні іх рашэнняў з-за мяжы, у Беларусі хапае сяброў па ўсім свеце, каб не дапусціць спекуляцый на гэту тэму ў ААН, і дастаткова магчымасцяў для падтрымання грамадскага парадку ў краіне. Тут дарэчы ўспомніць і аб стратэгічным партнёрстве Беларусі і Кітая (куды Прэзідэнт адправіцца з афіцыйным візітам у кастрычніку), і аб аўтарытэце нашай краіны ў Руху недалучэння (які аб'ядноўвае ў сваіх радах дзве трэці дзяржаў — членаў ААН). Невыпадкова Беларусь выбрана намеснікам старшыні Генеральнай асамблеі ААН — гэта таксама індыкатар трываласці нашых міжнародных пазіцый.

Спакуса рашуча ўмяшацца ў сітуацыю для геапалітычных ігракоў існуе толькі ў тым выпадку, калі сілы бакоў у канфлікце прыблізна роўныя. Калі ж рэйтынгі канкурэнтаў адрозніваюцца ў дзясяткі разоў — такія мары набываюць адценне старога анекдота: «Рабінові выключылі з партыі. Ён кладзецца спаць і бачыць сон, што па Маскве едуць амерыканскія танкі, над Крамлём развіваецца зорна-паласаты флаг, а з Крамля марпехі валакуць Брэжнева, які ўпіраецца. І суровы амерыканскі генерал строга гаворыць яму: «Неадкладна аднавіць Рабіновіча ў партыі!..»

Аляксей МАЦЭВІЛА, БЕЛТА.

МАХЛЯРСТВА ПА ПРЫКОЛЕ

ВЕЧАРАМ група маладых хлопцаў адпачывала на кватэры ў свайго знаёмага ў Жлобіне. Адзін з гасцей пацікавіўся змесцівам скрыначкі, якая была ў кватэры. У ёй ляжала купюра ў пяць тысяч рублёў Расійскай Федэрацыі. Ён пакруціў паперку, вельмі падобную на арыгінал, і ўбачыў на адваротным баку дробны надпіс: «Банк прыколаў».

Аднак сувенір не паклаў на месца, а прыхапіў з сабой. І, калі кампанія на таксі даехала працягваць адпачынак у вёску Лебядзёўка, грамадзянін расплаціўся з кіроўцам гэтай самай паперкай. Больш таго — узяў у якасці рэшты 400 тысяч ужо нашых рублёў. Паколькі разлік ішоў пасля гадзіны ночы, таксіст не заўважыў несапраўднасці купюры, а хлопцы працягвалі адпачынак на лёгка атрыманыя грошы. Калі раніцай наступнага дня ў адзін са жлобінскіх банкаў мужчына прыйшоў абмяняць расійскія грошы, ён сустрэўся там з групай затрымання аддзела дэпартамента «Ахова», а касір паказала надпіс — якім «банкам» насамрэч выпушчана гэтая папера. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага абвыканкама, па фотаздымках у міліцыі таксіст апазнаў 29-гадовага грамадзяніна, раней асуджанага за крадзеж. Цяпер яго «прыкол» цалкам упісваецца ў частку другую артыкула 209 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь — махлярства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска

Минский городской центр недвижимости

Торги проводятся в порядке, установленном Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Минского городского Совета депутатов от 23 сентября 2009 г. № 250.

Номер предмета торгов	1	2
Наименование и местонахождение предмета торгов, тип и характеристика помещения	Не завершенный строительством объект – «Магазин промышленных товаров в жилом доме № 6 по генплану со встроенными помещениями. Жилой район Дружба. Микрорайон «Дружба-1» (1-я очередь строительства)»	Не завершенный строительством объект – «Помещение предприятия бытового обслуживания № 1 в 9-этажном крупнопанельном жилом доме со встроенными помещениями № 6 по генплану. Микрорайон «Михалово-1»
Наименование продавца	КУП «Управление капитального строительства Мингорисполкома», г. Минск, ул.Советская, 17, тел. (017) 328 58 48	
Наименование организатора аукциона	КУП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, тел. (017) 227 48 36	
Общая площадь* (м.кв.)	1493,5	263,17
Начальная цена продажи (руб.)	1 096 395 676	470 000 000
Размер задатка (руб.)	109 639 568	47 000 000
Условия продажи	1. Сохранить функциональное назначение объекта. 2. В течение 30 дней с момента подписания договора купли-продажи компенсировать в бюджет г. Минска налог на добавленную стоимость (НДС). Сумма НДС уточняется на момент перечисления денежных средств при появлении дополнительных затрат проектно-изыскательских (ПИР), строительно-монтажных (СМР) и прочих работ. Суммы НДС составляют:	
	по состоянию на 01.05.2010 162 119 164 руб. (в т.ч. на ПИР 300 262 руб., на СМР 161 818 902 руб.)	по состоянию на 01.02.2010 67 362 977 руб. (в т.ч. на ПИР 137 041 руб., на СМР 67 225 936 руб.)
	3. В течение 30 дней с момента подписания акта приема-передачи компенсировать в бюджет г. Минска: 3.1. Стоимость дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих затрат, понесенных заказчиком после даты определения стоимости объекта (01.05.2010 по предмету торгов № 2, 01.02.2010 по предмету торгов № 3). 3.2. Стоимость выполнения ПИР, СМР и прочих работ по инженерным сетям, благоустройству и озеленению, проиндексированных на дату их перечисления по индексам изменения стоимости СМР по элементам затрат по г.Минску для расчета по ресурсно-сметным нормам (для работ, не освобождаемых от НДС), утвержденных приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь на момент перечисления затрат. Стоимость выполнения указанных работ составляет:	
	по состоянию на 01.05.2010 432 216 380 руб.	по состоянию на 01.02.2010 42 918 424 руб.
	4. В течение 30 дней с момента подписания акта приема-передачи компенсировать УП «УКС Мингорисполкома» (УНП 100115154, ОКПО 04014364, р/с 3012000032877 в филиале № 510 АСБ «Беларусбанк», г. Минск, ул. Куйбышева, 18, код 603) затраты по выплате земельного налога с момента принятия объекта до оформления правоустанавливающих документов на земельный участок.	
Условия оплаты	В течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.	

** Сведения о площадях объектов, не завершенных строительством, даются на основании проектно-сметной документации.*

Аукцион состоится **08 октября 2010 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в торгах по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583;

гражданином Республики Беларусь – копию документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

иностранным гражданином – копию документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представителем иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность;

представителем иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

заявление об ознакомлении с объектом продажи и документацией на него по установленной форме;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме.

При подаче документов на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

Победителем торгов по каждому предмету торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов подписывается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится в установленном порядке победителем аукциона (покупателем).

Победитель торгов в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона, обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов при заключительной регистрации под роспись.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни **с 23.09.2010 по 04.10.2010 г. с 9.00 до 17.00** (в пятницу – до 16.45, обеденный перерыв 13.00 – 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

(Ранее извещения о проведении торгов по продаже указанных объектов публиковались в газ. «Вечерний Минск» от 03.09.2010, в газ. «Звязда» от 04.09.2010).

Телефоны для справок:
227 48 36 (организатор аукциона),
328 58 48 (продавец).
Интернет: www.mgcn.by

Пішыце пісьмы!

Ведай нашых!

Штогод пад эгідай Міжнароднага бюро Сусветнага Паштовага Саюза праводзіцца моладзевы эпісталярны конкурс. Гэта значыць, што хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце да 15 гадоў з усіх канцоў свету пішуць лісты на зададзеную тэму.

Сёлета, напрыклад, у іх (у гэтых лістах-сачыненнях) трэба было паразважаць на тэму, чаму так важна гаварыць пра СНІД і бараніць адно аднаго ад гэтай хваробы.

У нашай краіне, як і ў мінулыя гады, конкурс праводзіўся ў некалькі этапаў — на раённым узроўні, на абласным, на рэспубліканскім, журы якога аднадушна вылучыла ў пераможцы васьмікласніцу Святлану Зіневіч з Залужскай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна. Яе ліст, ліст матулі (яна захварэла на СНІД, калі выцягвала з бойкі суседскага хлопчыка) ад імя ненароджанага пакуль дзіцяці, якое абяцае жыць і несці праўду пра гэтую хваробу, а потым вырасці і ўсё ж вынайсці лекі, кранаў сваёй непадробнай эмацыянальнасцю, шчырасцю...

Як паведаміла намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірына Ігнацьеўна Саксонава, твор Святланы атрымаў высокую адзнаку Міжнароднага бюро Сусветнага Паштовага Саюза: пісьмо вельмі асабістае, вельмі кранальнае і пранікнёнае...

Як вынік — у васьмікласніцы Святланы Зіневіч з Залужскай СШ другое месца ў 39-м міжнародным моладзевым эпісталярным конкурсе! Да яго ж — медаль і дыплом Сусветнага Паштовага Саюза, памятныя падарункі ад РУП «Белпошта». Усё гэта будзе ўручана Святлане на ўрачыстай вечарыне, прысвечанай Сусветнаму дню пошты, які адзначаецца 9 кастрычніка.

Ул. інф.

ДА 6 ГАДОЎ ЗА 400 ЛЯШЧОЎ

Неабыякавы да захавання прыроды грамадзянін паведаміў 18 верасня Глыбоцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету, што на возеры Шо Глыбоцкага раёна трое браканьераў ловяць рыбу сеткамі. Рэйдавая група адшукала трох жыхароў Наваполацка, якія лавілі рыбу з боку лесу і балота. З дапамогай 14 сетак яны здабылі на возеры Шо 401 ляшча, 40 плотак, 26 акунёў, 11 шчупакоў, 3 ліні. Страты, нанесеныя прыродзе, склалі звыш 15 млн рублёў. Ацэнку дзеянням браканьераў дасць Глыбоцкі РАУС і раённы суд. Зламыснікам пагражае да 6 гадоў пазбаўлення волі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

Дирекция ОАО «Минскводстрой» приглашает Вас принять участие во внеочередном собрании акционеров ОАО «Минскводстрой», которое состоится 4 октября 2010 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Шафарнянская, 11 (4-й этаж, актовый зал) (проезд до ст. метро «Уручье») с повесткой дня:

1. О заключении кредитного договора с ОАО «Белинвестбанк».
2. О предоставлении ОАО «Белинвестбанк» в залог имущества в обеспечение исполнения обязательств по кредитному договору.
3. Утверждение суммарной стоимости крупной сделки (взаимосвязанных сделок), совершаемой Обществом.
4. О полномочиях руководителя Общества по заключению и исполнению указанных договоров.

Регистрация участников собрания будет проводиться по месту проведения собрания **с 14.00 до 14.50.**

Явочный список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию **на 21 сентября 2010 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: **акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

Тел. для справок 265 61 04. УНП 600013209

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:

22 октября 2010 г. в 11.00 состоится ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже недвижимого имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе Лота № 1 (предмет торгов):

Лот № 1	
Незавершенный строительством комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Энергетиков, 5, в составе: незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3795 (административно-бытовой корпус) пл. 1941,8 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3797 (вспомогательный корпус) пл. 2776,3 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3796 (производственный корпус) пл. 5386 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3798 (заправка) пл. 87 кв.м; незавершенное кап. строение (очистное сооружение литер 5Б) пл. 14,67 кв.м; незавершенное кап.строение (очистное сооружение литер 4Б) пл. 14,78 кв.м; ограждение ж/бет. площадью 2244 кв.м с воротами металлическими площадью 12,6 кв.м; незавершенные строительством сооружения: покрытие бет. пл. 2550 кв.м, резервуары установки пожаротушения пл. 32,5 кв.м, грязеуловители, внутриплощадочные тепл. сети	
Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНП 102353509)**
Место проведения торгов и подачи документов	**г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»**
Начальная цена продажи, рублей без НДС	**4 761 032 330, размер задатка 238 051 620 рублей**
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000**
Площадь земельного участка	5,9884 га, правовой режим – право постоянного пользования
Характеристика объектов	
Здание адм.-быт. корп. – 3-эт. панельное, частич. кирпич, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, степень гот. – 42,6 %

22
ВЕРАСНЯ
2010 г.
СЕРАДА
№ 35 (15638)
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Актрыса, якая спявае

Вера Палякова, знакамітая актрыса, спявачка, вядучая ток-шоу «Жыццё як жыццё» на тэлеканале ЛАД, даўно не давала інтэрв'ю, на нейкі час знікла з тэатра і не паказвалася ў кіно. Што здарылася? Вера проста была ў дэкрэтным водпуску. Яе малодшаму сыну Арцёму нядаўна споўніўся год і два месяцы, сынок падрос і стаў на свае ногі, а ў маладой мамы з'явіўся час, каб у перапынках паміж здымкамі і хатнімі справамі падзяліцца навінамі з карэспандэнтам «ЧЗ» і проста пагутарыць пра «жыццё як жыццё».

— Вера, калі вам тэлефануюць і дамаўляюцца аб інтэрв'ю, якія пачуцці ў вас узнікаюць?

— Дзе знайсці час?! Праўда, шкада часу. Асабліва, калі запрашаюць на тэлевізійныя здымкі. Уявіце сабе, што трэба падабраць касцюм, зрабіць макіяж і прычоску, прыехаць, здымацца. Замест гэтага можна зрабіць кучу карысных спраў. Шчыра кажучы, у мяне ўжо ёсць імідж і пэўная папулярнасць. Адпачывала разам з сынам нядаўна ў санаторыі ў Сочы і да мяне падыходзілі зусім незнаёмыя людзі з воклікамі: «Ой, Верачка, а мы вас ведаем. А які ў вас хлопчык прыгожанькі, дайце ж на яго паглядзець!». Вось у чым вымяраецца папулярнасць, а не ў колькасці тэлевізійных гадзін.

— У ток-шоу «Жыцё як жыцё» ў вас амплуа простай, усё разумеючай сяброўкі. У сапраўдным жыцці вы такая ж, ці акцёрскі вопыт дапамагае?

— На ток-шоу я імкнуся быць такой, якая я ёсць у жыцці. Так пабудавана праграма: ты павінен адкрыць сваю душу, каб чалавек, які прыйшоў, таксама змог разняволіцца. Калі запрашаеш людзей на праграму, яны звычайна з захапленнем згаджаюцца. А ў студыі могуць расхвалявацца, дрыжаць і кідацца мне на калені : «Ой, Вера, я нічога не магу сказаць, ратуйце». І мая задача, як вядучай, супакоіць іх. Толькі на першы погляд здаецца, што прыйсці і расказаць сваю гісторыю — гэта лёгка. Перад табой сядзяць незнаёмыя людзі, знакамітыя персоны, якіх ты, магчыма, бачыў толькі па тэлевізары.

— Вера, вы тэлевядучая і актрыса. А што лепш?

— У першую чаргу, я драматычная актрыса. Усё астатняе: тэлебачанне, спевы — гэта дадатковыя рэчы. Нехта можа толькі іграць у тэатры, камусьці па душы кіно. А мне трэба ўсё разам. Мне цікава яшчэ і весці канцэрты, працаваць на ТБ.

— Ці можаце дзеля ролі змяніць знешні выгляд, напрыклад, як Кэтрын Зэта Джонс папаўнець на 20 кілаграмаў?

— Мне б пахудзець, а не паправіцца *(Смяецца)*. А то пасля нараджэння другога сына ўсё прыходзіць у форму не так хутка, як хочацца. Насамрэч, усё залежыць ад ролі, наколькі яна для мяне важная.

— Дарэчы, вы яшчэ і спяваеце. У 2007-м з'явіўся ваш сольны альбом «Актрыса». Плануеце працягваць музычную кар'еру?

— Я не спявачка, я актрыса, якая спявае. Увогуле, спяваць пачала раней, чым займацца акцёрскім майстэрствам. З 6 гадоў займалася ў школе з харавым ухілам. Танцавала, займалася па класе фартэпіяна і хацела стаць, як Ала Пугачова. Ідэя запісаць дыск прыйшла тады, калі мы многа калясілі па гарадах і сёлах з творчымі сустрэчамі. Заўсёды цікавей глядзець на артыста, калі ён нешта праспявае ці станцуе.

Цяпер музыкай не займаюся. Таму што ў мяне маленькі сын. Ды я ўвогуле малайчына *(смяецца)*. Калі Арцёму было ўсяго тры месяцы, выйшла на ток-шоу. У перапынках паміж здымкамі карміла малога.

— А якая вы мама?

— Я лічу, што дрэнная. А мае блізкія гавораць, што мамачка-квактуха. Ведаю адзінае: дзеля сваіх дзяцей магу пайсці на многае. І яны гэта ведаюць. Галоўнае, што я веру сваім дзецям на сто адсоткаў. Напрыклад, калі старэйшы Дзіма скажа, што яго нехта пакрыўдзіў, буду верыць яму, а не іншым.

— А па жыцці вы даверлівая?

— Я імкнуся верыць людзям. Аднак заўсёды бачу, калі яны не шчырыя са мной. (Вера адзіная з маіх субяседнікаў, хто не запатрабаваў матэрыял на вычытку. — **Аўт.**)

— Цікава, а як ставіліся бацькі да вашай прафесіі?

— Мае бацькі былі катэгарычна супраць, каб я была артысткай. Мама ў мяне доктар педагагічных навук, прафесар. Бацька мае тэхнічную адукацыю. Бабуля — стаматолаг. Яны, вядома, хацелі, каб я атрымала больш зямную прафесію. Мама марыла, каб я пайшла ў навуку, напісала дысертацыю. Аднак я заўсёды займалася творчасцю. Па-сапраўднаму верыць у маю прафесію бацькі пачалі зусім нядаўна. Ім было цяжка прыняць тое, што я ездзіла па нейкіх фестывалях, удзельнічала ў многіх праектах, набірала вопыт і папулярнасць. Тым больш у мяне рос Дзіма.

Зараз усё па-іншаму. Я разумею, што галоўнае — сям'я. Усё астатняе? Яно ёсць, але яно не аснова.

— Вы выкладаеце ў Беларускай акадэміі мастацтваў сцэнічны рух, сцэнічны бой і фехтаванне. Чаму такія не зусім жаночыя заняткі прыйшліся вам па душы?

— Так склалася, што на момант заканчэння Акадэміі па размеркаванні мяне бралі ва ўсе тэатры, пакуль не даведваліся, што я цяжарная. *(Смяецца.)* Усё ж такі мяне ўзялі ў ТЮГ, дзе я працавала роўна 60 дзён, пакуль не пайшла ў дэкрэт. І Лідзія Аляксееўна Сямашка, мой выкладчык па сцэнбою і сцэнруху, прапанавала паступіць у аспірантуру. Я вывучала і педагогіку, і логіку, пісала кандыдацкі мінімум, пісала дысертацыю, як і хацела мая мама, але не абараніла яе. Ездзіла ў Маскву, пераймала вопыт расійскіх калег. Вось так і склалася, што ў Беларускай акадэміі мастацтваў я адзіны педагог, які ведае гэтыя прадметы. Шчыра скажу, што не зарплата мяне там трымае, таму што яна мізэрная. Мне цікава выкладаць. І гэта вызначальны фактар.

— Як вы любіце адпачываць?

— Я адпачываю разам са сваімі дзецьмі. Я не наведваю свецкія вечарыны. Калі некуды хаджу, то толькі з мужам. Паколькі ён чалавек заняты, нам рэдка куды даводзіцца наведвацца. Мы любім выбірацца за горад. Нядаўна была на поўдні разам з дзецьмі. З імі ж наведваем санаторыі. Зімой усёй сям'ёй едзем у горы, катаемся на лыжах.

— Любіце экстрым на горных лыжах?

— У параўнанні з мужам і старэйшым сынам я катаюся кепска. Дзіма ў нас і з трамплінаў на лыжах умее — ажно духі займае. Я катаюся, як чайнік, так сказаць. Але з гор спускаюся.

— З хатнімі справамі спраўляецеся самастойна?

— У мяне ёсць памочніца. Таму я не без страху ўспамінаю тыя дні, калі яна была ў адпачынку. У суботу і нядзелю ў мяне спектаклі, і таму без памочніцы мне цяжкавата ўсё паспець адной. Дапамагаць няма ж каму. Муж заўсёды на працы. Убіраю, мыю, прасую кожны дзень. Гатую таксама сама. Многія нашы сябры прыязджаюць спецыяльна на мае катлеты.

— Падзяліцеся прафесійнымі планамі.

— Я вярнулася ў тэатр (Тэатр-студыя кінаакцёра. — **Аўт.**). Нядаўна ў нас адбылася прэм'ера спектакля «№ 13». Вярнулася і проста ў рэпертуар. Мне хацелася б цікавы спектакль і цікавую новую ролю. Хочацца працаваць і на ток-шоу — яно ж ужо як няк чацвёрты сезон. Песню новую трэба запісаць. Сяргей Сухамлін напісаў мне прыгожую «Калыханку». Глабальнага нічога здзейсніць не планую. Вярнуся хутка ў кіно. Прапановы ёсць, аднак мой малодшы сын не можа без мяне заснуць, таму начныя здымкі адмяняюцца. А я не люблю спазняцца і расчароўваць людзей.

Тое, што вы не ведалі пра Веру Палякову

1. У яе натуральны колер валасоў.

2. Любімыя стравы — катлеты з індычкі і тушаны трус.

3. Вельмі любіць салодкае, асабліва шакалад і сочнікі.

4. Пах дзяцінства — дом, у якім водар пірагоў.

5. Не ўмее вязаць і не карыстаецца Інтэрнэтам.

Вольга КОРШУН.

Ёсць нагода!

ШТО ЗАМЕСТ АЎТО?

Два гады запар 22 верасня беларускія аўтамабілісты спрабуюць адмовіцца ад звыклага камфорту. Еўрапейская камісія па навакольным асяроддзі аб'явіла сённяшні дзень Міжнародным днём без аўтамабіля ў 2000 годзе. Мэта гэтай кампаніі -- прыцягненне ўвагі грамадства да праблем, звязаных з уздзеяннем аўтатранспарту на якасць паветра і стан здароўя людзей. У гэтым годзе ў акцыі прымуць удзел 37 дзяржаў, уключаючы Беларусь. Для таго, каб не запавольваць звыклы рытм жыцця, патрэбныя альтэрнатыўныя аўтамабілю варыянты. Вось некаторыя з іх:

Размяць ногі

Для многіх аўтамабілістаў у тлуме важных спраў і штодзённай мітусні не стае часу, каб проста павольна прайсціся па вуліцах, а не імкліва пранесціся на сваім аўто ў звыклым напрамку. Калі да працы недалёка, пешая прагулка — найлепшы варыянт. Акрамя таго, атрымаеце цудоўную магчымасць падыхаць паветрам, чысцейшым, чым звычайна. Акцыя «Дзень без аўтамабіля» гэтаму спрыяе.

Размяць усё астатняе (паездка ў грамадскім транспарце)

Калі ёсць імкненне ўспомніць маладосць ці часы нядаўняга безкалёсага існавання, ваш шлях у Дзень без аўтамабіля пачнецца з прыпынку грамадскага транспарту. На ім 22 верасня можна бясплатна праехаць па вадзіцельскім пасведчанні. Забытае адчуванне пераможцы, які жывым і з неадтаптанымі нагамі дабраўся на аўтобусе на працу, вам гарантавана.

Новы сябар — ровар

Два колы — таксама колы. Калі вы не ўяўляеце сабе, як можна супрацоўніку саліднай кампаніі, падкасаўшы калашыны штаноў, ехаць на працу на ровары, пацікаўцеся, як гэта робіцца за мяжой. Напрыклад у Хельсінкі, Капенгагене, Амстэрдаме, узяўшы ровар напракат у адной частцы горада, у іншай, патрэбнай вам, можна пакінуць яго ў такім жа пункце пракату. У нас няма раскошы ў выглядзе грамадскіх роваряў, але такая штука можа пыліцца і ў вашым гаражы ці на балконе. Чым не нагода «выгуляць» яе ў Дзень без аўтамабіля?

Салідарнасць аб'ядноўвае

Калі ж ну ніяк не дабрацца ў патрэбнае месца, нават выкарыстоўваючы ўсе пералічаныя варыянты, самы час успомніць, хто з вашых сяброў ці знаёмых едзе ў тым жа напрамку. Яны таксама ніяк не згаджаюцца адмаўляцца ад аўто 22 верасня? Тым лепш! Проста прасіцеся, каб падвезлі. За вамі застанецца чыстае сумленне з-за чыстага навакольнага асяроддзя, для якога шкоды менш хаця б ад адной машыны, што вы пакінулі ў гаражы, і камфортная паездка на працу. Заадно і старыя адносіны падтрымаеце.

Ці зацікавяцца аўтамабілісты прапанаванымі альтэрнатывамі, мы высветлілі ў заўзятых аматараў асабістага транспарту:

Аляксандр Курылаў, кіроўца:

— Шчыра кажучы, я з задавальненнем у гэты дзень пераселю бы на ровар, але гэта немагчыма з-за маёй прафесійнай дзейнасці. А так я люблю і пешшу прайсціся, і на ровары пакатацца. Увогуле акцыю лічу карыснай.

Алена Іванова, галоўны бухгалтар, кіруе аўто ўжо 10 год:

— Без машыны ўжо як без рук: па рабоце трэба часта ездзіць, то ў падатковую, то яшчэ куды; дзіця таксама трэба вазіць. Гэтая акцыя — справа, вядома, добрая, але калі я пакіну аўтамабіль нават на адзін дзень, то гэта будзе сапраўдным выпрабаваннем.

Андрэй, рыэлтар, за рулём 1 год:

— Акцыя надуманая. Таксама можна прапанаваць: давайце адмовімся ад камп'ютараў ці ад мабільных тэлефонаў, бо яны шкодныя. А які будзе ад гэтага сэнс? Машына — частка нашага жыцця. Я лічу, што калі ўжо спрабаваць зменшыць шкодныя выкіды ў атмасферу, то трэба адразу ўсю прамысловасць спыняць і адыходзіць да ладу жыцця першабытнага чалавека. Да таго ж яшчэ ў нашай краіне няма ні адпаведнай культуры, ні абслугоўвання для таго, каб мы ўсе разам узялі ды селі на ровары.

Таццяна Сакалоўская, наведвае курсы ў аўташколе:

— Хадзіць пешшу сапраўды прыемна, калі ісці недалёка. Была б магчымасць, паступала б так кожны дзень. Але не выпадае, таму і хачу атрымаць правы. Зможам з'ездзіць на выхадныя ў прыгожае месца, пабачым краіну. Я ўжо атрымала пасведчанне, засталося здаць экзамены. Вельмі спадзяюся, што ўсё будзе добра.

Суд Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. у сувязі з паступіўшай заявай аб прызнанні адсутным без вестак **Кухта Мікалая Аляксандравіча**, 25 сакавіка 1971 года нараджэння, ураджэнца в. Студзянец Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл., апошняе вядомае месца жыхарства якога — в. Студзянец Ваўкавыскага р-на, просіць усіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Кухта Мікалая Аляксандравіча, паведаміць суду Ваўкавыскага р-на на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

У мабільным свеце

ЯК ПЛАЦІЦЬ ЗА МАБІЛЬНЫ ТЭЛЕФОН МЕНШ...

Не паспяваю класці грошы на тэлефон, як ізноў трэба папаўняць свой рахунак. Знаёмая сітуацыя? Здаецца, аператары сувязі прапаноўваюць усё больш выгодныя тарыфныя планы, а грошы як траціліся з хуткасцю ветру, так і трацяцца. Нават дзіву даешся: размаўляеш па тарыфе 0 руб. за хвіліну, а баланс усё роўна непазбежна цягнецца да таго ж нуля. А тут яшчэ, куды б ні пайшоў, усюды чуеш: гавары больш і плаці менш. Толькі мы, карыстальнікі мабільных тэлефонаў, усё роўна плацім, мякка кажучы, нямала.

Гаворка наша не пойдзе пра тое, як стаць прафесійным хакерам, які бясплатна карыстаецца мабільнымі паслугамі. Ды і што значыць бясплатна?! Ніхто ж не павінен аплочваць нашы размовы. Мы проста разам паспрабуем разгледзець і разабрацца ва ўсіх магчымых варыянтах, якія дазволяць мінімалізаваць нашы тэлефонныя затраты.

Усё пачынаецца з тарыфнага плана...

Самае галоўнае на шляху да эканоміі нашага бюджэту — правільна вызначыцца з тарыфным планам, незалежна ад таго, да якога мабільнага аператара мы падключаны (VELCOM, MTS, LIFE:)). Мабільныя кампаніі, дзеля таго, каб «заманьваць» патэнцыяльных кліентаў, выпускаюць іх цэлы спектр, прытым самых разнастайных. Тарыфныя планы з абаненцкай платай і без яе, з фіксаванай цаной за хвіліну і тарыфны, дзе кошт хвіліны размовы змяняецца ў залежнасці ад часу сутак (некаторыя маюць зніжаныя стаўкі ў начны час, па святах), з пахвілінай і з пасекундай тарыфікацыяй... Рэцэпта, як падключыцца «на самы танны» з іх, не існуе. Аднак падабраць найбольш выгодны асабіста для вас пры той тэлефоннай актыўнасці, якую вы ведзяце, рэальна. Для гэтага першапачаткова адкажыце самі сабе на наступныя пытанні. Мабільнік — гэта асноўны сродак стасункаў са знешнім светам ці вы карыстаецеся ім рэдка? Як доўга цягнуцца вашы размовы? Ці тэлефануеце на хатнія нумары, на нумары іншых мабільных аператараў, за мяжу? Ці патрэбен вам інтэрнэт у мабільным? Адказалі?.. Тады будзем выбіраць.

Абаненцкая плата: за і супраць

Тарыфныя планы з абаненцкай платай выгодныя тым, што шмат размаўляе, толькі тады вы зможаце не толькі «адбіць» сваю абанплату, але з пэўнай «шчаслівай» хвіліны пачнецца ваш «выйгрыш» па грошах (напрыклад, у параўнанні з тарыфам без абанплаты), бо цэны за хвіліны размовы на ім ніжэйшыя. Назіраецца прамая залежнасць: чым вышэйшая абанентка, тым таннейшыя званкі. У тарыфных планах без абаненцкай платы кошт хвіліны даражэйшы, аднак вы плаціце толькі за размову. Ён падыходзіць для тых, хто размаўляе рэдка. Вось толькі паняцці «рэдка» і «часта» трошкі суб'ектыўныя. У аднаго дзесяць хвілін цягнецца размова, а іншы столькі за месяц не прагаворвае. Таму не шкодзіла б раздабыць раздрукоўку званкоў, дзе былі б указаныя іх колькасць і працягласць. Пажадана за некалькі месяцаў, тады інфармацыя будзе больш аб'ектыўнай. Набыць яе можна ў цэнтрах абслугоўвання мабільных кампаній ці падключыўшы паслугу дэталізаваных рахункаў. Вядома, вы самі можаце запісваць, колькі вы званілі і куды, пры ўмове, што ў вас хопіць цярплівасці і вы не закінеце гэту справу. Ітак, усе неабходныя звесткі ў вас на руках. Выгоднасць будзем лічыць наступным чынам (не лянуйцеся гэта зрабіць, пасля ўсё вернецца з ліхвой): дзелім абаненцкую плату на розніцу цэнаў за хвіліну размовы для розных тарыфаў. Атрымаем крытычны час, да якога тарыфы адналькава выгодныя. Калі агульны час размоў меншы за крытычны, з упэўненасцю выбірайце тарыф без абаненткі. Калі вы насамрэч часта размаўляеце (агульны час большы за крытычны), то для вашага кашалька тарыф з абаненцкай платай — якраз тое, што доктар прапісаў. З дапамогай той жа раздрукоўкі робіцца выбар паміж тарыфаў з рознай велічынёй абаненцкай платы. Для тых, хто вядзе «тэлефонны» лад жыцця, танней абыдзецца тарыф з больш высокай абаненткай, як бы супярэчліва гэта ні гучала. Такім жа кшталтам выбірайце тарыфы, у аснове якіх не хвіліны размовы, а Мбайты інтэрнэт-трафіка.

Прааналізуйце гэта хаця б аднойчы, і вам нашмат лягчэй будзе зарыентавацца. Галоўнае — правільна выбрась тарыф, эканамічны для вас. Плюсы падлікаў і ў тым, што вы будзеце ведаць, куды ідуць вашы грошы. Ды і такога роду сістэматызацыя прывучыць да разумнай траты вашых сродкаў.

Правільныя прыярытэты — залог поспеху

Яшчэ адно важнае правіла пры выбары тарыфа — вызначыцца з вашымі прыярытэтамі: куды вы больш за ўсё тэлефануеце (на нумары вашага ці іншага аператара, на хатнія нумары, за мяжу...) і якія мабільныя паслугі вам патрэбныя. Важна, таму што мабільны закон такі: калі штосьці танней, іншае — даражэй. Схема наступная: абаненцкая плата ў вас 100 руб., кошт хвіліны на нумар свайго аператара — 1 руб., на «любімы» нумар — 0,5 руб.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

У 90 УСЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА!

Маладосць — час пераадолення крутых, да галавакружэння, вяршыняў. 90-гадовая гісторыя беларускай моладзевай арганізацыі пацвярджае, што юныя грамадзяне краіны іграюць вядучую ролю ў развіцці дзяржавы. Пра тое, што значаць для сучаснай моладзі традыцыі нашых дзядоў, як развіваецца арганізацыя сёння і якія вяршыні плануе скарыць заўтра, расказвае першы сакратар ЦК БРСМ Ігар БУЗОЎСКІ.

— Ліквідацыя непісьменнасці, усесаюзныя будоўлі і Вялікая Айчынная — гэтыя вехі нашай гісторыі не абышліся без удзелу камсамола. Якія задачы даводзіцца вырашаць яго правапераемніку — Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі сёння?

— Сапраўды, шмат няпростых задач стаяла перад камсамольцамі ў XX стагоддзі. Пасля таго як Беларусь стала суверэннай дзяржавай, моладзевы рух краіны атрымаў магчымасць развівацца, абапіраючыся на вопыт папярэдніх пакаленняў. У 2002 годзе кіраўнік беларускай дзяржавы падтрымаў ідэю аб'яднання дзвюх найбольш масавых арганізацый краіны — Беларускага Саюза Моладзі і Беларускага Патрыятычнага Саюза Моладзі — і стварэнні на іх аснове адзінага Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі (БРСМ). Сёння гэта самая масавая арганізацыя ў краіне, якая аб'ядноўвае не менш як 500 тысяч юнакоў і дзяўчат. З году ў год расце колькасць першасных арганізацый БРСМ у навучальных установах, на прамысловых прадпрыемствах, у АПК, у часцях і падраздзяленнях Узброеных Сілаў РБ, структурах МУС і МНС, органах дзяржаўнага кіравання.

Маладыя і аптымістычныя члены БРСМ ажыццяўляюць праекты ў розных сферах — эканоміцы, культуры, адукацыі. Усе гэтыя гады моладзевая арганізацыя з'яўляецца актыўным удзельнікам важных дзяржаўных праграм. На жаль, пра жыццё моладзі старэйшае пакаленне часам мяркуе аднабока — не так апрануты, не так ходзяць, не тыя песні спяваюць. Гэта няправільнае меркаванне. Абсалютная большасць актыўных, разумных і таленавітых маладых людзей глыбока разумеюць праблемы сучаснасці.

— Якія праекты арганізацыі можна назваць прыкметай нашага часу?

— Сучасныя маладыя людзі імкнуцца быць годнымі памяці тых, каму ў страшныя гады Вялікай Айчыннай вайны прыйшлося абараняць кожную пядзю роднай зямлі. Саюз моладзі паставіў перад сабой задачу не пакінуць без увагі ніводнага ветэрана мінулай вайны і членаў сем'яў загінулых. Сёння многія юнакі і дзяўчаты знайшлі сябе ў дабрачынным сацыяльным добраахвотніцкім руху БРСМ «Добрае сэрца». Яны прыйшлі да ветэранаў і

адзінокіх састарэлых людзей. Яны даглядаюць помнікі і абеліскі вайсковай славы, брацкія магілы. Падчас працоўных акцый актывісты БРСМ аказалі дапамогу ў добраўпарадкаванні святынь беларускай зямлі. Гэта Хатынь і Курган Славы, Брэсцкая крэпасць і Буйніцкае поле, музей камсамольскай славы Обальскага падполля і іншыя аб'екты.

Шырокую падтрымку атрымала акцыя БРСМ «Моладзь — ветэранам!», а таксама сумесны рэспубліканскі праект БРСМ і Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі «65!», прысвечаны 65-й гадавіне вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Толькі ў 2010 годзе ў моладзевым марафоне «65!» прынялі ўдзел больш за 100 тысяч чалавек. За два месяцы з канцэртнымі праграмамі марафонцы пераадолелі тысячы кіламетраў па маршруце Мінск—Віцебск—Магілёў—Гомель—Брэст—Мінск—Гродна—Курган Славы.

Стала ўжо традыцыйнай акцыя Гродзенскага камітэта па ўрачыстым прыёме ў БРПА і БРСМ на моладзевай заставе ў Падліпках. З непадробным гонарам і радасцю юнакі і дзяўчаты ўдзельнічаюць у мерапрыемствах Усебеларускай акцыі БРСМ «Мы — грамадзяне Беларусі!»: у Дзень Канстытуцыі нашай краіны 16-гадовым падлеткам ва ўсіх рэгіёнах краіны ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюць іх галоўны дакумент — пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. У гэты дзень маладыя людзі атрымліваюць пажаданне ад ветэранаў, прадстаўнікоў заканадаўчай і выканаўчай улады. З 2008 года, апроч пашпарта, маладым людзям уручаюць ілюстраванае падарункавае выданне «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь», дзе выкладаюцца артыкулы Канстытуцыі, прыводзяцца прыклады яе ўжывання, а з 2010 года — «Пашпарт маёй краіны», распрацаваны БРСМ спецыяльна для гэтага праекта. Гэта акцыя падкрэслівае, што быць грамадзянінам — гэта высокі гонар і адказнасць як перад грамадствам, так і перад самім сабой. Вучоба, павага да бацькоў і сям'і, добразычлівыя ўзаемаадносіны з людзьмі, беражлівае стаўленне да навакольнага свету, адказнасць за сваё здароўе — усё гэта складнікі росквіту Беларусі.

Моладзевая акцыя БРСМ «За Беларусь!», прысвечаная Дню Незалежнасці, стала візітнай карткай арганізацыі. Знак акцыі — чырвона-зялёная стужачка — увасабляе гонар за краіну, у якой мы жывём. У мерапрыемствах акцыі штогод бяруць удзел каля паўмільёна чалавек. Вялікай і патрэбнай справай з'яўляецца работа арганізацыі па фармаванні моладзевых атрадаў аховы правапарадку (МААП). Ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі МУС у рэспубліцы дзейнічаюць каля двухсот такіх атрадаў, якія дапамагаюць міліцыі захоўваць спакой грамадзян, праводзіць профілактыку правапарушэнняў у моладзевым асяроддзі.

— Пра тое, што моладзь не можа быць пасіўнай, кажа і факт удзелу маладых беларускіх грамадзян у выбарах розных узроўняў. Ці не так?

— Безумоўна. Значнасць укладу кожнай грамадскай арганізацыі ў развіццё краіны вызначаецца, у тым ліку, і яе ўдзелам у грамадска-палітычных падзеях. БРСМ заўсёды займаў канструктыўную пазіцыю і прымаў непасрэдны ўдзел у выбарчых працэсах. Толькі ў 2010 годзе амаль 5 тысяч актывістаў саюза працавалі ў складзе выбарчых камісій, а таксама ў якасці назіральнікаў на выбарчых участках падчас выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў. Дарэчы, сёння дэпутатамі мясцовых Саветаў з'яўляюцца 911 членаў нашай арганізацыі. Іх работу ў сферы рэалізацыі дзяржаўнай моладзевай палітыкі каардынуе Рэспубліканскі клуб маладых дэпутатаў «Выбар маладых».

БРСМ і ў далейшым плануе актыўна ўдзельнічаць у працэсах грамадска-палітычнага жыцця краіны. Мы не палітычная арганізацыя, але мы маем сваю грамадзянскую пазіцыю, якую заяўляем і адстойваем. Актывісты БРСМ прымуць удзел у кампаніі па выбарах прэзідэнта.

— Студэнты і навучэнцы — адзін з самых актыўных атрадаў моладзевай арганізацыі. Якія праекты і акцыі праводзяць студэнты?

— Па ініцыятыве БРСМ і БРПА ва ўсіх навучальных установах краіны ў 2010 годзе прайшла Усебеларуская акцыя «Пытанне Прэзідэнту». Такія праекты дапамагаюць арганізацыі лепш спазнаць імкненні моладзі, знайсці новыя, часам нечаканыя рашэнні праблем, даюць магчымасць зразумець матывацыю ўчынкаў таго ці іншага маладога чалавека. Аналіз пытанняў паказаў, што дзеці, моладзь актыўна цікавяцца будучыняй сваёй краіны, яе развіццём, эканомікай і палітыкай.

З 2003 года БРСМ аказаў дапамогу ў працаўладкаванні больш як 360 тысяч юнакоў і дзяўчат. Будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна», гасцініцы «Еўропа», гасцінічна-спартыўнага комплексу «Вяслярны канал» у Брэсце, гандлёвага комплексу «Аэрадромны» ў аэрапорце «Мінск-1», гандлёвага цэнтра «Падземны горад» у сталіцы, стадыёна «Нёман» і карпусоў абласной клінічнай бальніцы ў Гродне, заасаду ў Магілёве, дамоў на сяле, дапамога ў падрыхтоўцы беларускіх гарадоў да фэстаў працаўнікоў сяла «Дажынкі», рэканструкцыя мемарыяльных комплексаў «Хатынь» і «Буйніцкае поле», Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, Нясвіжскага замка і іншае — гэта толькі невялікі пералік з гісторыі сучаснага студатрадаўскага руху.

Беларускія студэнцкія атрады пашыраюць сваю геаграфію і актыўна працуюць за межамі Беларусі: Ленінградская, Смаленская, Маскоўская, Свярдлоўская, Чыцінская вобласці, Краснадарскі і Стаўрапальскі край, Ямала-Ненецкая аўтаномная акруга Расійскай Федэрацыі, Казахстан, Украіна, Польшча... Дзякуючы супрацоўніцтву БРСМ з моладзевым грамадскім агульнарасійскім рухам «Расійскія студэнцкія атрады» ў 2010 годзе беларускі будаўнічы атрад працаваў на будаўніцтве алімпійскіх аб'ектаў Сочы.

Добраахвотніцкія атрады БРСМ працуюць на сацыяльна значных аб'ектах свайго роднага краю — добраўпарадкаванні школ, дзіцячых дамоў і прытулкаў, дзіцячых пляцовак, паркаў і сквераў, архітэктурных комплексаў і інш. Валанцёры займаюцца пасадкай дрэў, кветак, расчышчаюць звалкі, добраўпарадкоўваюць берагі рэк і вадаёмаў, бяруць удзел у археалагічных раскопках.

— БРСМ заўсёды імкнуўся прапагандаваць здаровы лад жыцця. Якія з акцый больш за ўсё запомніліся самім арганізатарам і блізка ўспрыняты моладдзю?

— БРСМ арганізуе і праводзіць мерапрыемствы па развіцці моладзевага і дзіцячага спорту, аздараўленню, рэалізуе праекты і праграмы, накіраваныя на профілактыку негатыўных з'яў у моладзевым асяроддзі, барацьбу са шкоднымі звычкамі. Па ўсёй краіне традыцыйна праводзяцца спаборніцтвы па хакеі «Залатая шайба», па футболе «Скураны мяч», па гандболе «Імклівы мяч», разнастайныя спартакіяды, турпаходы і турзлёты, фестывалі здаровага ладу жыцця, акцыі «Кніга супраць тытуню», «Мяняю цыгарэту на цукерку», «Не курэнню!», «Забі на цыгарэту», «СТОП-СНІД!», «Антытытунёвы дэсант», «Формула будучыні: МОЛАДЗЬ+ЗДАРОЎЕ», «Кірмаш здароўя» і інш.

Ініцыяваны моладдзю Віцебшчыны рух БРСМ «Я люблю цябе, ЖЫЦЦЁ!» стаў рэспубліканскім. Яго мэта — фарміраванне «моды» на здаровы лад жыцця, прафілактыка тытунёвай, алкагольнай, наркатычнай залежнасці. Актыўны ўдзел у руху «Я люблю цябе, ЖЫЦЦЁ!» прымаюць прадстаўнікі моладзевых субкультур: бі-баі, скейт-бардысты, велатрыялісты, ролеры і інш. Напрыклад, адкрыты чэмпіянат Беларусі па брэйк-дансу «Сіла двух-2010» сабраў пад сцягамі БРСМ тысячы маладых людзей. Не менш папулярнымі былі спаборніцтвы сярод прадстаўнікоў экстрэмальных відаў спорту з усіх рэгіёнаў Беларусі, арганізаваныя БРСМ на Дні моладзі ў рамках Міжнароднага фэсту мастацтваў «Славянскі кірмаш у Віцебску».

— Якія праекты вы плануеце актыўна развіваць у будучыні?

— Мы будзем рабіць акцэнт на другасныя занятасці моладзі. Для нас гэта прыярытэтны кірунак. Неўзабаве мы плануем падвесці вынікі працоўнага семестра 2010 года і Рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта БРСМ «Уладар сяла». Гэты конкурс год ад году набірае абароты. Традыцыйна ў спаборніцтвах бяруць удзел маладыя сем'і да 35 гадоў, якія працуюць на сельскагаспадарчых прадпрыемствах і маюць дзяцей. Сярод тураў конкурснай праграмы ёсць абавязковы — «Лепшы сельскі падворак». У ім маладым татам, мамам і іх дзецям прадстаўлена магчымасць блісnуць арыгінальнасцю афармлення і дагледжанасцю свайго прысядзібнага ўчастка і жылля. Менавіта ў такіх спаборніцтвах сямейныя падрады праяўляюць свае ўменні, спрыт і згуртаванасць. Упершыню конкурс стартаваў у 2007 годзе ў Глыбоцкім раёне і прыйшоўся маладым вяскоўцам па густу. Праз год моладзевая ініцыятыва была распаўсюджана на ўсю рэспубліку.

У Беларусі плануецца правесці інавацыйны форум «Моладзь. Інавацыі. Будучыня». Мэта мерапрыемства — стымуляваць удзел моладзі ў пабудове інавацыйнай эканомікі Беларусі, пазначыць неабходнасць рашэння пэўных дзяржаўных задач моладзевай палітыкі ў навуковай, вытворчай і сацыяльнай сферах. На форум прыбудуць каля 400 дэлегатаў. Плануецца, што ў гэтым сумесным з Акадэміяй навук мерапрыемстве прымуць удзел самыя актыўныя маладыя навукоўцы — актывісты БРСМ.

БРСМ стаў годным праваперамеснікам камсамола Беларусі, зарэкамендаваў сябе пэўнымі справамі. Але і наперадзе праца мае быць вялікая.

Кар. БЕЛТА.

«МІС ІНТЭРКАНТЫНЕНТАЛЬ-2010» МОЖА ПРАЙСЦІ БЕЗ БЕЛАРУСКІ

Гэта дзіўна. Беларусь, чые дзяўчаты апошнія два гады атрымлівалі тытул «Міс Інтэркантыненталь-Еўропа» і ўваходзілі ў ТОП-5 самых прыгожых на конкурсе, у гэтым годзе не будзе ўдзельнічаць у шоу. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказаў днямі Еўрапейскі дырэктар Сусветнай арганізацыі прыгажосці Дзітлаф Тэрсіс.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Мы не едзем

— На сёння мы заключылі дамовы з 71 краінай, — гаворыць Дзітлаф Тэрсіс. — Таму сёлета чакаем 71 удзельніцу. На жаль, Беларусь у спісах не прадстаўлена, што нас вельмі засмучае. Прынамсі, мы яшчэ чакаем навін з беларускага боку. Канкурсанткі прыбудуць на Карыбы 25 кастрычніка, фінал пройдзе ў суботу 6 лістапада.

— Беларусь проста не падала заяўку?

— Так, Беларусі няма ў спісах. У беларускага боку, накольмі мы зразумелі, няма зацікаўленасці ва ўдзеле. Але мы не можам чакаць: вольныя месцы ў хуткім часе будуць занятыя краінамі-дэбютанткамі, якія свае заяўкі на ўдзел ужо падалі. Гэта — Самоа, Трынідад і Табага, Тонга, Люксембург, Інданезія, Малайзія, Андора, Парагвай, Аргенціна і Віргінскія Астравы.

Мы едзем

— Мы будзем удзельнічаць у конкурсе, — пацвердзіла ўдзел Беларусі ў конкурсе **дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга СЯРОЖНІКАВА**. — У нас ужо ёсць кандыдатура.

— Ці можна сцвярджаць, што гэта будзе Ганна Кіндрук?

— Мы ўжо думаем пра яе і літаральна сёння запланавана сустрэча з ёй. І калі ў нас усё будзе складвацца добра, на гэтым жа тыдні і пачнецца падрыхтоўка.

— Беларусь ужо адправіла сваю заяўку?

— Сваю заяўку на ўдзел мы адправілі на мінулым тыдні. Проста зараз шмат сілаў забірае падрыхтоўка да конкурсу «Міс Свету». Конкурсаў шмат, і яны супалі на адзін час — кастрычнік, тым больш што дакументы ідуць дастаткова доўга.

Новую міс назавуць у Карыбах

Конкурс «Міс Інтэркантыненталь-2010» пройдзе сёлета ў горадзе Пунта Кана (Дамініканская Рэспубліка). Карыбскія астравы ўпершыню за сваю гісторыю прымаюць конкурс такога ўзроўню. Між іншым, на права правядзення конкурсу ў сваёй краіне прэтэндавала яшчэ чатыры краіны: Шры-Ланка, Мальдзівы, Мальта і Егіпет.

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Наутилус» (далее – Организатор), расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Урицкого, 27, ком. 1 «А», Свидетельство о государственной регистрации выдано Бобруйским городским исполнительным комитетом 10 июля 2009 года, УНН 700253946.

Наименование рекламой игры – «Планета Horizont – воплощает мечту!».

Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь в магазинах «Планета Horizont», расположенных по адресам: г. Бобруйск, ул. Минская, 105 – магазин «Планета Horizont»; г. Могилев, пр-т Мира, 59 «А» – магазин «Планета Horizont»; г. Мозырь, ул. Пролетарская, 80 – магазин «Планета Horizont»; г. Осиповичи, ул. Интернациональная, 42 – магазин «Планета Horizont»; г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 143 – магазин «Планета Horizont», г. Бобруйск, ул. Минская, 105, магазин «Цифровой дом».

Начало рекламой игры «Планета Horizont – воплощает мечту!» 23 сентября 2010 г., окончание 31 марта 2011 г.

Рекламная игра «Планета Horizont – воплощает мечту!» проводится в целях стимулирования реализации аудио, видео и бытовой техники в особенности товаров отечественных производителей, которые реализуются в указанных выше магазинах.

2. В целях контроля за объективным проведением рекламной игры создается комиссия по проведению рекламной игры в составе пяти человек, в том числе председатель комиссии, состав которой утверждается Организатором.

В состав комиссии по проведению рекламной игры «Планета Horizont – воплощает мечту!» входят:

Председатель комиссии:

• Киселев Анатолий Эдуардович – начальник Управления торговли Бобруйского горисполкома;

Члены комиссии:

• Матюшенок Татьяна Николаевна – заведующая Бобруйским корреспондентским отделом РУПРТЦ «Телерадиокомпания «Могилев»;

• Рудько Юрий Николаевич – заместитель директора ООО «Наутилус» по организационным вопросам;

• Черкашина Галина Александровна – заведующая магазином «Планета Horizont» г. Бобруйск, ООО «Наутилус»;

• Дашук Екатерина Олеговна – юрисконсульт ООО «Наутилус».

Комиссия по проведению рекламной игры осуществляет свою деятельность в соответствии с зарегистрированными в установленном порядке правилами данной игры. Заседания комиссии правомочны при наличии большинства членов зарегистрированного ее состава. Решение комиссии оформляются протоколом, который должен быть подписан всеми присутствующими на заседании членами комиссии.

Члены комиссии обязаны:

- осуществлять контроль над правильностью проведения рекламной игры, включая порядок выдачи приза;
- проводить розыгрыши рекламной игры с оформлением соответствующих протоколов;
- выполнять иные обязанности, необходимые для проведения рекламной игры в соответствии с требованиями законодательства и настоящих правил.

Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников рекламной игры в течение всего срока действия собственных полномочий.

3. К участию в Игре допускаются все совершеннолетние граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, и лица, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно в ней проживающие.

В Игре не имеют права участвовать:

- работники и представители организатора рекламной игры и члены их семей;
- работники рекламных агентств, связанных с организатором договорными отношениями (обслуживающих игру) и члены их семей;
- работники и представители любых других юридических лиц, причастных к организации или проведению розыгрыша игрового фонда и члены их семей;
- граждане, привлеченные рекламными агентствами и юридическими лицами на основании гражданских договоров для обслуживания игры в любой форме и члены их семьи.

4. Для участия в рекламной игре необходимо с 23 сентября 2010 года по 13 февраля 2011 года (включительно) приобрести любой товар в магазинах «Планета Horizont», расположенных по адресам: г. Бобруйск, ул. Минская, 105 – магазин «Планета Horizont»; г. Могилев, пр-т Мира, 59 «А» – магазин «Планета Horizont»; г. Мозырь, ул. Пролетарская, 80 – магазин «Планета Horizont»; г. Осиповичи, ул. Интернациональная, 42 – магазин «Планета Horizont»; г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 143 – магазин «Планета Horizont», г. Бобруйск, ул. Минская, 105 – магазин «Цифровой дом».

Каждый покупатель, приобретающий товар, получает с документом, подтверждающим приобретение товара, корешок купона магазина «Планета Horizont». Вторая часть купона с координатами покупателя (ФИО, домашний адрес, телефон) опускается покупателем в находящийся в торговом зале специальный рекламный ящик по 13 февраля 2011 года.

Каждый участник имеет право принимать участие в игре такое количество раз, которое соответствует количеству документов, подтверждающих приобретение товаров и заполнение купонов, необходимых для участия в игре.

5. Призовой фонд игры сформирован за счет имущества Организатора и состоит из:

№ п/п	Наименование	Кол-во (штук)	Стоимость 1 шт., руб.	Сумма, руб. Без учета НДС
1.	Автомобиль Peugeot 308 5P Premium 1. 6E	1	53 625 267	53 625 267
2.	Тур. ваучер на 2-х чел. (в одну из стран: Египет, Израиль, ОАЭ, Индия, Марокко, Маврикий, Кипр, Доминикана, Мальдивские острова, Сейшельские острова, Китай, Греция, Финляндия, Австрия, Германия, Андорра, Франция, Испания, Швейцария, Бельгия, Голландия, Таиланд)	1	15 000 000	15 000 000
3.	Тюнер спутникового цифр. тел-го приема Horizont 700D	1	184 580	184 580
4.	Мониторы ЖКИ 15ML01Horizont	2	417 310	834 620
5.	Жидкокрестал. телевизор 32WL67R Toshiba LSD C	1	3 543 524	3 543 524
6.	Вакуумный пылесос Panasonic MC-CG663ZR79	1	429 044	429 044
7.	Пылесос Philips FC 8212	1	332 044	332 044
8.	Пылесос Philips FC 8258	1	279 079	279 079
9.	Фоторамка цифровая Philips 9FF2CWO/00	1	742 973	742 973
10.	Телевизор Horizont 14A03	1	204 000	204 000
11.	Телевизор Horizont 21AF 42	1	347 260	347 260
12.	Портативный компьютер Samsung NP-N148-DP01UA	1	949 750	949 750
13.	Телевизор Horizont 42 LCD825	1	1 858 474	1 858 474
14.	Телевизор Horizont 29CF57S сереб.	1	674 500	674 500
15.	Телевизор Horizont 22 LCD812	1	873 050	873 050
16.	Микроволновая печь Daewoo KOR-4125A	1	150 300	150 300
17.	Микроволновая печь Daewoo KOR-6305A	1	157 050	157 050
18.	Микроволновая печь Daewoo KOR-4115SA	1	145 700	145 700
19.	СВЧ-печь Horizont 20MW800-1378	6	170 000	1 020 000
20.	СВЧ-печь Horizont 20MW800-1479	4	200 000	800 000
21.	СВЧ-печь Horizont 20MW800-1379	4	205 000	820 000
22.	Пылесос Horizont ПНВ-1600 перл. беж.	4	130 300	521 200
23.	Электрочайник MOULINEX BAB1LE Type: BAB1	1	102 450	102 450
24.	Электрочайник BRAUN WK 210 (BL)	1	106 550	106 550
25.	Электрочайник BRAUN WK 210 (GN)	1	106 550	106 550
26.	Пароварка BRAUN FS 20 R 63216709 3216	1	157 050	157 050
27.	Пищевой процессор Philips HR 7620 (7620/70)	1	188 000	188 000
28.	Электроутюг BRAUN 320 6 3670709 3670	1	108 750	108 750

Общая сумма призового фонда составляет 85 828 435 (восемьдесят пять миллионов восемьсот двадцать восемь тысяч четыреста тридцать пять) белорусских рублей.

6. Розыгрыш призового фонда состоится 14 февраля 2011 г. в 12.00 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Урицкого, 27.

Все рекламные ящики из выше указанных магазинов должны быть доставлены по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Урицкого, 27 до 11.00 14 февраля 2011 года.

Представители Организатора вскрывают по очереди все рекламные ящики и помещают все находящиеся в них отрывные купоны в лототрон, крутят его, а члены комиссии следят за честностью и правильностью розыгрыша. Один из членов комиссии достает выигрышный купон из лототрона и называет номер купона и фамилию участника, указанную на нем, а также приз в последовательности, соответствующей расположению призов в таблице.

Для выдачи приза тур. ваучер на 2-х чел. (в одну из стран: Египет, Израиль, ОАЭ, Индия, Марокко, Маврикий, Кипр, Доминикана, Мальдивские острова, Сейшельские острова, Китай, Греция, Финляндия, Австрия, Германия, Андорра, Франция, Испания, Швейцария, Бельгия, Голландия, Таиланд) победителю необходимо обратиться до 28 февраля в СОДО «Визит-Тур» для выбора комплекса туристических услуг.

Результаты розыгрыша фиксируются в протоколе, который по окончанию розыгрыша подписывают все присутствующие на заседании члены комиссии.

Участники, занесенные в протокол, подписанный комиссией, считаются победителями рекламной игры «Планета Horizont – воплощает мечту!».

7. О результатах рекламной игры, месте и времени получения приза победителя информируют по телефону и почтовыми уведомлениями в срок до 20 февраля 2011 года (включительно).

Выдача призов Организатором будет производиться в срок до 23 марта 2011 года, с момента получения уведомления победителя о выигрыше приза – с 10.00 до 16.00 (за исключением субботы и воскресенья).

Место получения призов победителями – РБ, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Урицкого, 27, офис ООО «Наутилус».

8. Для получения приза выигравшему участнику игры необходимо предъявить свой паспорт и корешок купона. Призы не подлежат замене или обмену. Выплата денежного эквивалента стоимости приза не осуществляется. Расходы, связанные с проездом к месту выдачи призов, с транспортировкой призов, Организатором не компенсируются.

9. С момента передачи приза победителю к последнему переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом.

В случае отказа победителя от получения приза, неполучения приза в установленные настоящими правилами порядке и сроки либо невыполнения условий его получения приз остается у Организатора и используется по своему усмотрению.

В случае отказа в визе победителю приз остается у Организатора и используется по своему усмотрению.

10. Участие в рекламной игре означает ознакомление и полное согласие участников с настоящими правилами рекламной игры.

11. Правила рекламной игры «Планета Horizont – воплощает мечту!», состав комиссии и призовой фонд рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала рекламной игры.

12. Результаты розыгрыша призового фонда рекламной игры «Планета Horizont – воплощает мечту!» будут опубликованы в газете «Звязда» до 31.03.2011 года.

13. По вопросам, связанным с проведением рекламной игры, обращаться по телефону в г. Бобруйске – 8 0225 58 59 71, 8 0225 58 50 18.

Свидетельство о регистрации рекламной игры № 1762, выдано Министерством торговли РБ 21.09.2010 г. УНП 700253946. Лицензия № 74100/0541978, выдана 11.08.2009 г. Бобруйским городским исполнительным комитетом.

ГУП «СЭЗМИНСКИНВЕСТ»

26 октября 2010 г. в 11.00 ПРОВОДИТ КОНКУРС ПО ПРОДАЖЕ ЛЕГКОВОГО АВТОМОБИЛЯ по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 28А, к. 203.

Торги проводятся в соответствии с требованиями Указа Президента Республики Беларусь от 14 сентября 2006 г. № 575 «О порядке распоряжения государственным имуществом» (в ред. от 07.05.2009 № 238); Инструкции о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утв. Пост. Государственного комитета по имуществу РБ № 36 от 30.03.2009 г. (в ред. от 01.07.2009 г. № 43).

Предметы торгов:

1. Легковой автомобиль Хундай Соната, 2006 г. вып., объем двигателя 2,4 л, мощность двигателя 174 л.с., бензин, АКПП, Г/У, пробег 215 109 км, противотуманные фары, цвет – бежевый перламутр, полная масса 1860 кг; производитель – Южная Корея.

Начальная цена: 22 980 440 рублей без учета НДС 20 %.

Продавец и организатор торгов: ГУП «СЭЗМИНСКИНВЕСТ». Предмет торгов находится в г. Минске.

Приоритетное условие – наивысшая цена, предложенная участником конкурса.

Сумма задатка – 50 000 рублей должна быть перечислена на счет ГУП «СЭЗМИНСКИНВЕСТ» р/с 3012149400014 в ф-ле № 514 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Сурганова, 47а, код 614, в срок не позднее 26 октября 2010 г.

Прием заявлений производится по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 28А, к. 203 по рабочим дням с 9.00 до 18.00.

Время окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов – 10.30 26 октября 2010 г.

Срок подписания договора купли-продажи предмета торгов – не позднее 10 дней с момента подписания протокола о результатах конкурса.

Контактные телефоны в Минске: 283 16 96, 283 16 77, факс 285 24 04. УНП 190000020.

ООО «ВЕБ ЭКСПЕРТ»

объявляет о проведении аукционов на реализацию услуг по размещению рекламы на порталах TUT.BY, Mail.ru, RBC.RU, Kocht.com, в период с 22 октября по 31 декабря 2010 года.

Организатором аукциона является **ООО «Веб Эксперт»**, УНП 191089974, **г. Минск, пр-т Независимости, 95, офис 509, телефон (017) 2873758**, расчетный счет 3012017153004 в РКЦ № 1 ЗАО «БелСвиссБанк», пр-т Победителей, 23/3, код 175 г. Минск.

С графиком проведения аукционов, порядком их проведения, формой заявки на участие в аукционе, а также начальной ценой предмета аукциона можно будет ознакомиться более подробно на сайте http://webexpert.by/ в разделе Аукционы после 4 октября 2010 года.

Для участия в аукционе участникам необходимо направить в адрес организатора заявление на участие в аукционе и перечислить на расчетный счет организатора задаток в размере одна тысяча белорусских рублей.

У ЧУЖЫМ САДЗЕ ЯБЛЫКІ СМАЧНЕЙШЫЯ

68-гадовы пенсіянер з вёскі Барэц Лоеўскага раёна разам з 49-гадовым напарнікам абчысцілі сад суседкі. Амаль 150 кілаграмаў яблыкаў знялі з пладовых дрэў сладзеі ў год, калі на Гомельшчыне, здаецца, няма яблыні, якая б не ўрадзіла. Але ж чужыя яблыкі, відаць, больш смачныя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении открытого аукциона по продаже права аренды земельного участка в г.п. Шарковщина Витебской области

- для строительства и обслуживания торгового павильона в г.п. Шарковщина, ул. Комсомольская, площ. 0,0050 га, кадастровый № 225555100001001926, срок аренды 25 лет, расходы, связанные с изготовлением документации 1 399 102 руб., начальная цена продажи 352 418 руб.

1. Аукцион состоится **22 октября 2010 в 11.00 по адресу: Витебская область, г.п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15.** Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00 по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Последний день приема заявлений и документов **18.10.2010 до 17.00.** Заключительная регистрация участников **22.10.2010 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положениями, утв. Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 года № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия – наличие не менее двух участников. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

3. К участию допускаются физ. и юр. лица, подавшие документы в соответствии с п. 4 настоящего извещения. Задаток за участие в аукционе составляет 10 % от начальной цены лота. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», ул. Ленина, 22/16, код 701. Получатель – РУП « Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

4. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении подать заявление и подписать Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить следующие документы: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр.лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юр.лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр.статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность.

5. Условие: внесение платы за право заключения договора аренды, возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, расходов по формированию землеустр. док-ции, заключение договора аренды в течение 2-х дней после внесения всех платежей, осуществление в 2-мес. срок после принятия решения гос. регистрации права на зем. уч-к, получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработка проекта на строительство в срок, не превышающий 1 г., строительство объекта в сроки, определенные ПСД.

6. Ориентировочные затраты на организацию и проведение аукциона составляют **1 803 196** рублей. Фактические затраты будут объявлены дополнительно перед проведением торгов.

Контактные телефоны: 8 (0212) 435 435; 435 495; 8 (029) 591 00 02; 8 (029) 384 24 05; тел. в г.п. Шарковщина (8 02154) 4 12 42.

ЧАЛАВЕК-КРЫНІЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й старонцы.)

АДПАВЕДНА легендзе, калісьці невялікая рэчка сюды прынесла абразок. Знайшла яго мясцовая жыхарка, а ў гонар гэтага з'яўлення была ўзведзена драўляная каплічка. Вада з некалькіх крыніц, якія збягалі ў глыбокі яр, стала дапамагаць і лекаваць, і месца хутка стала славутым. Некалькі разоў капліцу над крынічнай вадой бурылі і ўзводзілі нанова. Цяперашняя бела-цагляная капліца была пабудавана ў часы гарбачоўскай перабудовы, на жаль, архітэктурнай каштоўнасці яна не мае. Ранейшыя студня і купель былі ў нядрэнным стане, таксама зробленыя рукамі ўмелага Алега Вайцяховіча, але эстэтычны выгляд усяго месца жадаў лепшага. Алег даўно выношваў думку прывесці тэрыторыю ў парадак. Але колькі не думай, без фінансавых укладанняў справу з месца не зрушыш. Вайцяховічу пашанцавала — знайшоўся чалавек, якому таксама захацелася зрабіць свой унёсак для землякоў — былы жыхар суседняй вёскі Завуцце, які цяпер жыве ў Маскве — Васіль Лукашэвіч. Наведаўшы крыніцу Яна, Алег з Васілём дамовіліся, што ўпарадкаваць яе — справа іхняга гонару. А святару Чарневіцкай царквы айцу Сергію, да якога з прапановаю прыйшлі землякі, засталося толькі блаславіць іх на добрую справу.

Фундатар Васіль ЛУКАШЭВІЧ атрымаў ад прыхаджан у падзяку абраз Хрыста Збавіцеля.

Святар Чарневіцкай царквы айцец Сергій асвячае новую-старую крыніцу святога Яна.

Новая купель шырокая, глыбокая і зусім не халодная.

— Самым цяжкім кавалкам усёй працы была купель, глыбіня якой дасягае паўтара метра. Калі леташнім лістападам пайшлі грунтовыя воды, было нязручна класці падлогу і рабіць сцены. Працавалі нават у халоднай вадзе, бо не паспявалі адпампоўваць яе, клалі цяжкія, кіло па 150-200, лагі, прыбівалі дубовыя дошкі. Намучыліся, — кажа Алег. — Я нават не разлічваў на такія вялікія маштабы, хоць звонку яны такімі не падаюцца..

— А хто дапамагаў выконваць цяжкую фізічную працу, кідаўся першым на дапамогу?

— Даводзілася наймаць часовых, часам аднадзённых, работнікаў, у асноўным з вёскі Язна. За невялікую плату, абед і добрую чарку. За дзякуй ніхто працаваць не жадаў. Як я ні шукаў, не знайшоў ніводнага, хто б пагадзіўся на дзень-два паехаць да крыніцы, папрацаваць бясплатна, прадаставіць сваю аўтатэхніку. Не знайшлося і такіх устаноў.

На сваім самаробным трактары Алег зрабіў не меней за паўсотню рэйсаў па 30 кіламетраў. Ездзіў дамаўляцца ў Глыбокае на распілоўку і дастаўку дошак, за што вельмі ўдзячны Глыбоцкай ЖКГ, хоць крыніца тэрытарыяльна адносіцца да Мёрскага раёна.

— Спякотным летам, у самы разгар работ, да крыніцы ехала шмат людзей, асабліва моладзі, — працягвае прыгадваць Алег. — Яны бачылі, як мы, стоячы на каленях, працавалі, абліваліся потам, аднак ніхто ні разу не прапанаваў сваёй дапамогі — ці паднесці мяхі з цяжкім цэментам, ці камень падаць, ці бервяно падняць. Толькі набіралі крынічнай вады, плёскаліся ў купелі, садзіліся за сталы адпачываць і есці. Напэўна, прымалі нас за звычайных калымшчыкаў.

І ўсё ж абысціся без памагатых ніяк не выпадала. Кветкі, напрыклад, пасадзіла настаўніца біялогіі Чарневіцкай школы. А дзеці з настаўнікамі з Язненскай школы падносілі каменне, фарбавалі агароджу. Сам айцец Сергій браўся за рыдлёўку і чысціў купель пасля вясновай паводкі. Фундатар Васіль Лукашэвіч прывёз з Белакаменнай водны сток-кораб з зялёнага граніту, абажурнае кальцо на студню, тратуарную плітку.

За час, ахвяраваны на крыніцу (а Алег Вайцяховіч працаваў бясплатна), ён мог бы змайстраваць добры дзясятак лодак. Ці, нарэшце, давесці да розуму свой дом, які трынаццаць гадоў стаіць недабудаваны. Але адступаць не было як. І мець спалоханы выгляд, што ўзяўся за справу, якая пад сілу цэлай будаўнічай арганізацыі, было нельга.

На адкрыцці, як заўсёды, было шматлюдна. Падыходзілі паломнікі не толькі з навакольных вёсак ці бліжэйшых Полацка і Глыбокага, а нават з Астраўца, Ашмянаў і Мінска прыехалі да святога Яна. Мне ж бачылася, што прыехалі яны да язненца Алега Вайцяховіча, які сціпла стаяў на ўскраіне і паглядаў на шчаслівых людзей.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Мёрскі раён.

Вады і піць, і аблівацца хопіць цяпер кожнаму.

Першае святочнае застолле каля крыніцы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.55	19.09	12.14
Віцебск —	6.44	18.59	12.15
Магілёў —	6.45	18.59	12.14
Гомель —	6.41	18.55	12.14
Гродна —	7.10	19.24	12.14
Брэст —	7.11	19.25	12.14

Месяц
Поўня 23 верасня.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны
Пр. *Ганны, Аляксея, Васіля, Захара, Іосіфа, Мікіты, Рыгора, Сяргея, Феафана, Фядоса, Харытона, Якіма.*
К. *Маўрыця, Тамаша.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

22 верасня

Міжнародны дзень без аўтамабіля (World CarFree Day). Праводзіцца ў многіх краінах свету ў імя клопату пра навакольнае асяроддзе і здароўе людзей; у некаторых гарадах Еўропы адзначаецца на працягу цэлага тыдня.

1903 год — нарадзіўся (горад Заслаўе) Хвядос Шынклер, беларускі празаік. Працаваў у рэдакцыях раённых газет, у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя рэвалюцыі». Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Адзін з першых у беларускай літаратуры звярнуўся да тэмы рабочага класа, паказваў новыя адносіны сярод людзей. Аўтар зборніка апавяданняў «Стрэлачнік Міргай», аповесцяў «Сонца пад шпалы», «Пульс жыцця» і іншых. Пісаў п'есы, аповесці для дзяцей, рэцэнзіі, артыкулы, нарысы. Загінуў на фронце ў 1942 г. пад Сталінградам.

1935 год — у СССР зацверджана воінскае званне Маршал Савецкага Саюза і уведзены іншыя афіцэрскія званні, за выключэннем генеральскіх.

Цытата дня:

«Добрае выхаванне найлепш абараняе чалавека ад тых, хто дрэнна выхаваны».

Філіп Дормер Чэстэрфілд (1694—1773), англійскі пісьменнік і грамадскі дзеяч.

НЯДЗЕЛЯ

У навуковай літаратуры існуюць два супрацьлеглыя пункты гледжання на месца нядзелі ў традыцыйнай сістэме тыднёвага ўпарадкавання і злічэння часу. Прыхільнікі адной версіі лічаць, што нядзеля была першым днём, ад якога пачынаўся адлік часу на новым тыдні. Паслядоўнікі другога сцвярджаюць, што нядзеля ў сярэднявечных календарах лічылася апошнім днём тыдня.

● Пасля распаўсюджання хрысціянства нядзеля стала не першым і не апошнім, а ключавым, рытуальна маркіраваным днём тыдня. Гэты дзень быў па-за кантэкстам працы чалавека. Ён лічыўся часам для дыялогу з Космасам, Богам, і яго нельга было прыніжаць паўсядзённымі заняткамі. Выключнасць нядзелі даказвае той факт, што ў час святкавання Вялікадня забаранялася нават запальваць агонь у печы.

● Наданне нядзелі статуса выключнасці знайшло адлюстраванне ў культуры славянскіх народаў. Гэты дзень быў асноўным у структуры вясельнага абраду. З яго пачыналася новая старонка ў жыцці маладых людзей. Жанчыны, нарадзіўшыя дзіця, імкнуліся прымеркаваць час першага выхаду з нованароджаным з хаты ў невядомы свет менавіта да нядзелі. Выключны статус святасці нядзелі паўплываў і на забарону правядзення лячэбных сеансаў у гэты дзень.

● У нядзелю нельга працаваць, выносіць смецце і попел з печы; у нядзелю не выпякалі хлеб (лепш сядзець увогуле без хлеба, чым парушыць гэта правіла). У першую нядзелю верасня, раніцай, каб засцерагчы сваю гаспадарку ад пажараў, чыталі спецыяльную замову: «Аганёк, аганёк ад Госпада Бога, ды не дай табе Бог раскошы ні гарэць, ні ўзгарацца, вадой разліваца. І дай табе Бог так гарэць, як Гасподняй свячэ. Табе, хараміна, дагараць, а ты, аганёк, лажыся спаць. Прыкрыў аганёк Мікіта, Лука, трэцяя рука».

● У гадавым колазвароце асаблівым статусам былі пазначаны наступныя святочныя нядзелі: Масляныя загвяны, Прашчоная, Сырапусная нядзеля (нядзеля на 9-м тыдні напярэдадні Вялікадня), Збор, Ізбор, Зборніца (нядзеля на 7-м тыдні напярэдадні Вялікадня); апошняя нядзеля перад святкаваннем Вялікадня атрымала назву Вербная нядзеля, Вербніца, Вербіца, Вярбіч, Вярба. Адно з самых галоўных святаў хрысціянства — Уваскрэсенне Ісуса Хрыста — святкуецца толькі ў нядзелю; у нядзелю на наступным тыдні святкавалі Антыпасху, Фаміну нядзелю, Красную горку, Ярылавіцу, Праводы; нядзеля 3-га пасля Вялікадня тыдня атрымала назву Міраносцы, або Бабскае свята; нядзеля 7-га тыдня пасля Вялікадня — Тройца, Пяцідзясятніца, Сёмуха, Клечанне, Пятроўскія запускі; Русальчыны розыгрыш — нядзеля 8-га тыдня пасля Вялікадня.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Самыя прыгожыя дзяўчаты з'яўляюцца на пляжы ў апошні дзень адпачынку...

☺

Дыялогі ў сеціве.

1 — А мой кот ужо 12 гадоў мяне цешыць. І яшчэ ён лячэбны.

2 — Ароматэрапія?

3 — Завараваш?

☺

Калі жанчына заве мужчыну сволачу — значыць, ён усё зрабіў правільна.

Шаноўнага **Аркадзя ЖУРАЎЛЁВА**, ідэолага і пісьменніка, віншуем **з 55-годдзем**! Жадаем жыццёвай радасці ад творчых удач, здароўя, сямейнай утульнасці, жыццялюбства і аптымізму.

З цеплынёю — твае сябры.

23 ВЕРАСНЯ — ДЗЕНЬ ВОСЕНЬСКАГА РАЎНАДЗЕНСТВА

ЗАЎТРА Сонца ў чарговы раз перасячэ нябесны экватар і пройдзе з паўночнага паўшар'я нябеснай сферы ў паўднёвае. У паўднёвым паўшар'і нашай планеты наступіць астранамічная вясна, у паўночным — восень, якая будзе цягнуцца да зімовага сонцастаяння (22 снежня). 23 верасня працягласць дня і ночы на ўсёй Зямлі будзе аднолькавай — 12 гадзін. Аднак з-за рэфракцыі, якая як бы «прыўзнімае» Сонца над гарызонтам, светлавы дзень будзе доўжыцца крыху больш.

Беларусы, як і іншыя ўсходнія славяне, здаўна лічылі дзень восеньскага раўнадзенства святам і адзначалі яго пірагамі з капустай, брусніцамі і мясам, а таксама народнымі гуляннямі. У гэты дзень рабінавыя гронкі разам з лісцем устаўлялі вечарам паміж аконнымі рамамі, бо лічылася, што, пачынаючы з дня восеньскага раўнадзенства, сонца пачынае слабець, а рабіна будзе ахоўваць хату ад сілаў цемры.

У Японіі дзень восеньскага раўнадзенства з 1878 года з'яўляецца афіцыйным святам і адзначаецца старажытнымі абрадамі будыйскага свята Хіган. Сем'і ідуць пакланіцца магілам сваіх продкаў, аказваюць ім неабходныя рытуальныя ўшанаванні.

У Мексіцы ў гэты дзень турысты імкнуцца наведаць знакамітую піраміду Кукулькан (на мове мая — «птушыны змей») у старажытным горадзе Чычэн-Іца. Піраміда арыентавана адносна Сонца такім чынам, што менавіта ў дні веснавога і восеньскага раўнадзенства яго промні праецыруюць цені платформаў на край галоўнай лесвіцы ў выглядзе контуру змея.

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ТВОРЫ КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ

В. Квяткоўскі (Украіна)



Белыя: Крg7, Ла8, Лg2, Сh3. Kf8, п. e5 (6)

Чорныя: Крe7, Ле1, пп. e2, g4, g6, h5 (6)

Мат за 3 хады.

В. Барсукоў (Санкт-Пецярбург, Расія)



Белыя: Крg5, Кd6, Kf5 (3)
Чорныя: Крh8, п. f4 (2)
Мат за 16 хадоў.
Чакаем вашых адказаў.

КАЗАЧНЫЯ ШАХМАТЫ

Шахматная кампазіцыя падраздзяляецца на дзве вялікія і самастойныя галіны развіцця — артадаксальную (задачы на прамы мат, эцюды) і казачную (задачы са зменены заданнем, формай дошкі, новымі фігурамі).

У нас у Беларусі ў гэтай галіне папулярызуюцца толькі задачы на кааператыўны і адваротны мат. Што сабою ўяўляюць гэтыя два віды задач? Звернемся да прыкладаў.

А. Ашэўнеў. Прыз, 2009 г. **Белыя**: Крpc5, Ла5, Cd5, Cd8, Kg5, п. f6 (6). **Чорныя**: Крg6, Фc3, Лc8, Лd3, Cb8, Ch1, Кc6, Kd6, пп. a6, a7, c4, e3, h6 (13). Кааператыўны мат за 2 хады.

У такіх задачах першы ход робяць чорныя, іх мэта — дапамагчы белым аб'явіць мат чорнаму каралю, г.зн. разам выканаць умову.

У дадзенай задачы гэта дасягаецца наступным чынам: а) дыяграма. 1. Cc7 Кр:c6 2. Ke4 Cf7х б) белага Cd5 замяніць на б. каня. 1. Лc7 Кр:d6 2. Kd4 Kf4х.

У задачы комплекс ідэй: самазвязванне з наступным развязваннем, перакрыццё — раскрыццё лініі, Грымшоу. Задачы на кааператыўны мат вядомы з даўніх часоў. Першая кніга са зборам такіх кампазіцый М. Ланга датуецца 1854 годам.

У задачах на адваротны мат пачынаюць белыя. Яны прымушаюць чорных аб'явіць мат беламу каралю. Такія задачы вядомы з XIII стагоддзя.

Р. Свабода. 1947 г. **Белыя**: Kph1, Фb2, Cg1, Ca8, Kf5 (5). **Чорныя**: Kph3, п. g4 (2). Адваротны мат за 2 хады. Рашэнне. 1. Cf3! — цугцванг, 1...gf 2. Фg2+ fgx, 1...g3 Ce2! g2x.

БЕЛАРУСЫ КІНУЛІСЯ ГАЛАСАВАЦЬ І ВЫВЕЛІ СВАЙГО БАЙЦА Ў СУСВЕТНЫ ФІНАЛ К-1

Ведай нашых

У першыню ў гісторыі адразу двое нашых землякоў паб'юцца за карону найлепшых ударнікаў планеты. Гэта тайбаксёр Віталь Гуркоў і баец без правілаў Андрэй Арлоўскі. Апошні трапіў у фінальны турнір дзякуючы галасаванню фанатаў, якое разрэкламавалі ў «Звяздзе» і на інтэрнэт-партале TUT.BY.

Другога верасня на старонках «Звязды» з'явіўся матэрыял «Прагаласуйце за беларускіх байцоў у фінале адзінаборстваў К-1». Ініцыятыву падтрымаў папулярны інтэрнэт-партал TUT.BY.

Арганізатары К-1склалі спіс з 21 прэтэндэнта, сярод якіх былі тры беларусы. Шасцёра з гэтага спісу траплялі ў сусветны фінал. Яшчэ дзесяць фіналістаў вызначылі раней — па выніках кваліфікацыйных Гран-пры і леташніх выступленняў.

Тысячы чалавек кінуліся галасаваць за беларускіх байцоў.

І ў жаданую шасцёрку трапілі адразу два беларускія суперцяжы — Андрэй Арлоўскі (трэцяе месца) і Аляксей Ігнашоў (чацвёртае месца). На жаль, апошні атрымаў траўму і не зможа прыняць удзел у фінале. А вось пра Арлоўскага днямі напісалі ўсе байцоўскія сайты планеты.

Арлоўскі зрабіў сабе імя ў так званых баях змяшанага стылю (іх у народзе называюць «баямі без правілаў»: можна біць, дужацца, рабіць балевыя прыёмы, душыць). Быў чэмпіёнам свету ў звышпрэстыжнай версіі UFC. А вось па правілах К-1, дзе можна толькі біцца рукамі і нагамі, Андрэй не выступаў ніколі.

Сёння Арлоўскі жыве ў Чыкага, і яго папулярнасць — гэта не журналісцкія казкі. На сайце arlovski.com хапае цікавых фотаздымкаў і відэазапісаў з амерыканскімі суперзоркамі. Вось Андрэй размаўляе са сваім прыяцелем — акцёрам Мікі Руркам, былым баксёрам. Вось фатаграфуецца з Жан Клодам Ван Дамам, які зняў Арлоўскага ў адной з частак свайго фільма «Універсальны салдат».

Хоць Андрэй доўгія гады жыве ў ЗША, ён выходзіць біцца пад беларускім сцягам. Яго першым супернікам у фінале К-1 будзе румынскі накаўцёр Рауль Кацінас, якога паставілі ў турнір замест траўмаванага Аляксея Ігнашова.

Ніколі не бачыў жыўцом Андрэя Арлоўскага, а вось з яго супернікам Кацінасам пазнаёміцца давялося. Мелі таварыскую гутарку ўлетку 2009 года, за дзень да Гран-пры К-1 у Лодзі.

— Я вельмі матываваны, я гатовы біцца з любым і, калі патраплю, накаўтую любога, — упэўнена і натхнёна паведаміў мне Рауль. На наступны дзень ён сышоўся на рынгу з яшчэ адным беларускім байцом, Забітам Самедавым, які важыў на 20 кг меней, але прыгожа перамог румына ў ашаламляльным двубоі. І вось яна, несправядлівасць: Забіта на фінал гэтага года не запрасілі, а румын атрымаў свой шанц. Такім чынам, былому самбісту Андрэю Арлоўскаму давядзецца адстойваць гонар усіх беларускіх суперцяжаў.

Трэцяга кастрычніка, на наступны дзень пасля фінальнай шаснаццаткі суперцяжаў, на рынг выйдуць лепшыя ўдарнікі свету сярэдняй вагавай катэгорыі (70 кг, так званае К-1 MAX). Тут усе ўдзельнікі вызначыліся па кваліфікацыйных Гран-пры. Гонар Беларусі будзе адстойваць чэмпіён свету па тайскім боксе Віталь Гуркоў (клуб «Патрыёт»). Ужо вядомы яго супернік — мінулагодні чэмпіён К-1 Джорджыа Петрасян (Італія).

Пераважная большасць экспертаў лічыць, што шанцаў у беларуса, адразу кінутага пад танкі, няма. Асноўная прычына ў тым, што ў К-1 забароненая барацьба ў стойцы, а гэта — галоўная каронка Гуркова. Тым не менш Віталь вылучаецца бескампрамісным характарам (апантана змагаецца да тае самае пары, пакуль стаіць на нагах) і тактычнай непрадказальнасцю.

— Большасць думае, што ён (Петрасян, — **«Звязда»**) мяне ўдарыць. Але ўсё гэта — раскручанае імя Петрасяна. Лічу, што ў мяне будуць шанцы, — суха пракаментаваў свой хуткі двубой Віталь Гуркоў.

Вынік бітвы паміж беларусам і італьянцам — гэта поўная загадка.

Яўген ВАЛОШЫН.

ХТО ТАКІ ВІТАЛЬ ГУРКОЎ?

Узрост — 25 гадоў.
Рост — 184 см.
Вага — ад 67 да 71 кг.

Нарадзіўся ў Мінску. Займацца тайскім боксам пачаў з 14 гадоў. У 17-гадовым узросце нечакана перамог на чэмпіянаце свету па муай-тай у вазе 60 кг. З тае пары на чэмпіянатах планеты паразаў не меў. І гэта абсалютны рэкорд.

Выступіць па правілах К-1 (а менавіта гэтыя спаборніцтвы яднаюць найлепшых у свеце байцоў-ударнікаў) атрымалася толькі ў 2010 годзе. Правілы для Віталя аказаліся вельмі нязручнымі. Перамагчы на ўсходнееўрапейскім Гран-пры аказалася складана. Тым не менш Гуркоў стаў найлепшым і ўвайшоў у шаснаццатку найлепшых байцоў свету.

Віталь Гуркоў стаў першым беларускім спартсменам, які даў нацыянальнаму тэлебачанню інтэрв'ю на роднай мове.

Вышэйшую адукацыю атрымаў па спецыяльнасці «менеджмент у сферы турызму». У вольны ад трэніровак час займаецца музыкай.

ХТО ТАКІ АНДРЭЙ АРЛОЎСКІ?

Узрост — 31 год.
Рост — 193 см.
Вага — 109 кг.
Мянушка — Пітбуль.

Нарадзіўся ў Бабруйску. У дзяцінстве не мог за сябе пастаяць. У 14-гадовым узросце пайшоў у трэнажорную залу, потым — у секцыю самба. Актыўна трэніравацца пачаў пасля паступлення ў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў. Міліцыянерам не стаў.

У 20-гадовым узросце перамог на моладзевым чэмпіянаце свету па самба. Паралельна пачаў займацца кікбоксінгам і тайскім боксам, выступаць у змешаных адзінаборствах.

Пад кіраўніцтвам трэнера Дзмітрыя Сцяпанава стаў чэмпіёнам свету ў версіі UFC (адна з дзвюх самых прэстыжных версій на планеце па баях без правілаў).

Калі ж Андрэй пасварыўся са сваім трэнерам і пераехаў жыць у Чыкага, то атрымаў празмерную ўвагу з боку журналістаў і фанатаў.

У выніку мінулы сезон стаў самым няўдалым у карьеры беларуса. Ён прайграў накаўтамі Фёдару Емяльяненку (наймацнейшы баец свету), Брэту Роджэрсу (ЗША) і па вачах саступіў Антоніа Сільве (Бразілія).

Нягледзячы на мінулагоднія няўдачы, усе аўтарытэтныя байцоўскія часопісы пазначаюць, што Арлоўскі дагэтуль уваходзіць у дзясятку найлепшых байцоў змяшанага стылю. Андрэю ўсяго 31 год. Спадзяемся, што яго найлепшыя байцоўскія дасягненні яшчэ наперадзе.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4622 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12